незалежная газета

№ 44 (642) 25 лістапада 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Грып сыходзіць, але не развітваецца**

Старонка 2



**«Вялікі брат» ад МТС**

Старонка 12



**Навумаў супраць Лукашэнкі**

Старонка 6

## У НУМАРЫ

**«Звязда» пачала пляжыць Расію**

За апошні тыдзень дзяржаўная газета апублікавала тры вельмі крытычныя матэрыялы. **Старонка 3.**

**Рандэву з Іванам Жахлівым**

Новае расійскае кіно пра старыя расійскія праблемы. **Старонка 12.**

**Цуд з рухавічком**

Дзяўчыне з Бабруйска, якая не можа хадзіць, моладзь сабрала грошы на электрычны вазок. **Старонка 10.**

**Аляксандр Кулінковіч**

Калі ты забаронены, ты не развіваешся. **Старонка 13.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Мядзведзеў — Лукашэнку: Не адграбай

23 лістапада прэзідэнт Расіі даў інтэрв'ю чатырнаццаці беларускім СМІ. Рэпартаж рэдактара «Нашай Нівы» **Андрэя Скурко** з Барвіхі.





**Элегантны кляштар у Барунах ператварылі ў туалет**

Рэпартаж Юліі Дарашкевіч. **Старонка 16.**

## «Мы не заўважылі, як падышла смерць»

Сям'ю мінчанкі Алесі Коршак пандэмія грыпу не проста зачапіла. Яна яе разбурыла. У адной сталічнай кватэры на вірусную пнеўманію захварэлі трое — сама Алеся, яе муж Сяргей і свякроўка Галіна Філіпаўна. Мужа выратаваць не ўдалося.

Эпідэмія віруснай пнеўманіі, страшная — што б ні казалі ўлады — нават у сухой медыцынскай статыстыцы, становіцца проста невыносна страшнай, калі гаворка заходзіць пра канкрэтныя чалавечыя лёсы.

Шмат хто чуў пра тое, што ў далёкага сваяка суседа знаёмага знайшлі свіны грып, ці чытаў такія гісторыі ў інтэрнэце. Але чуць пра некага і сутыкнуцца з трагедыяй лоб у лоб — прынцыпова розныя рэчы.

### Першыя дні хваробы

Супрацоўніца «Беларускай энцыклапедыі» Алеся — прыгожая маладая жанчына, яшчэ нядаўна шчаслівая жонка. Цяпер яна не можа гаварыць без слёз. Лістапад 2009 года кардынальна змяніў яе лёс.

За час размовы Алеся ні разу не здолела прамовіць слова «памёр», расказваючы пра Сяргея. Альбо спрабавала інакш пабудаваць фразу, альбо проста прапускала страшнае слова.

**Працяг на старонцы 5.**

Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджанне «Нашай Ніве» за артыкул пра эпідэмію грыпу. Адначасова папярэджанні атрымалі таксама «Комсомольская правда в Беларуси» і «Народная воля». **Старонка 7.**



**Сяргей Коршак згарэў за некалькі дзён.**

## Грып сыходзіць, але не развітваецца

У снежні нас чакае новая эпідэмія.

Вірусная навала адступае, канстатуюць медыкі. На мінулым тыдні колькасць зваротаў з нагоды ВРВІ знізілася больш чым напалову. Такая карціна назіраецца па ўсёй краіне. Спала і хваля панікі: амаль зніклі чэргі ў аптэках. Аднак расслабляцца рана: у снежні нас чакае новая эпідэмія грыпу.

У адрозненне ад кастрычніцкай хвалі, у снежні прыйдзе сезонная навала, да якой медыкі ў гэты перыяд рыхтуюцца штогод.

На сёння ад сезоннага грыпу прышчэпленыя больш за 977 тысяч чалавек — на 31,4% больш, чым летась. Планавая вакцынацыя скончылася, але людзі працягваюць прышчэплівацца за свае грошы, за кошт мясцовых бюджэтаў.

Чакаецца новае паступленне замежных вакцынаў у канцы лістапада — пачатку снежня. Сусветная арганізацыя аховы здароўя паставіла ў Беларусь 60 тысяч упаковак антывіруснага сродку Таміфлю. Перад наступам новай эпідэміі лекары нагадваюць: строгае выкананне правілаў асабістай гігіены перадусім; калі захворвання не ўдалося пазбегнуць, не пераносьце хваробу на нагах, не цягніце да апошняга са зваротам да лекараў.

**Сямён Печанко**

КАМЕНТАР РЭДАКЦЫІ

# Мытны саюз: Беларусі трэба падтрымка

Брусэль павінен даць сігнал, што кампенсуе Мінску часовыя страты ад непадпісання Мытнага саюза з Расіяй.




Фактычна, Беларусь была ў Мытным саюзе з Расіяй усе гэтыя гады. Апроч некалькіх другарадных (хоць і важных для некаторых групаў насельніцтва, як мыта на ўвоз аўтамабіляў) пазіцый, беларуская мытная палітыка была абсалютна прывязаная да расійскай. Падпісанне Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі мае забетанаваць гэтую арматуру.

Такі Мытны саюз — канструкцыя ідэалагічная ці, прынамсі, вытворная такіх канструкцый. На нарадзе па Мытным саюзе Лукашэнка ўпершыню ясна адцеміў адрозненне ў структуры эканомік і доўгачасовых інтарэсах цэнтральнаеўрапейскай краіны Беларусі і еўразіяцкіх сыравінных гігантаў Расіі і Казахстана. Перад Беларуссю — зусім іншыя перспектывы.

Мытны саюз апраўдваюць неабходнасцю прывілеяванага доступу да расійскага рынку (пра ўнутрырасійскія цэны на вуглевадароды больш не мроіцца). Аднак Фінляндыя дзесяцігоддзямі падтрымлівала выдатныя палітычныя і эканамічныя адносіны, не ўваходзячы ў інтэграцыйныя канструкцыі, здольныя абмежаваць яе суверэнітэт. Яна экспартавала ў Расію і імпартавала з Расіі ўсё патрэбнае.

За гэтым быў палітычны выбар: інтэграцыя з гіганцкім і імперскім суседам непазбежна вядзе да нераўнапраўя. Але за гэтым была і абарона нацыянальнай этыкі працы, этыкі ўзаемаадносінаў — найбольшага скарбу як нашага, так і фінскага, не толькі культурнага, але і эканамічнага.

Стаўленне беларускіх прамыслоўцаў і вытворцаў паслуг да кірунку эканамічнай інтэграцыі розніцца ў залежнасці ад таго, адкуль яны імпартуюць і куды экспартуюць. Жлобін, Азот і Нафтан і падобныя будуць цягнуць за Мытны саюз. Аднак у краіне сфармаваліся і ўплывовыя групы інтарэсаў, арыентаваныя і, галоўнае, гатовыя да адаптацыі да еўрапейскіх стандартаў.

Непадпісанне Мытнага саюза — будзьма рэалістамі — прывядзе да карных мераў Масквы. Расія не прыдумае нічога фатальнага — лепей разарваць Мытны саюз, пакуль БТС-2 і «Нордстрым» не гатовыя. А галоўнае, Беларусь заўжды будзе мець козыр калінінградскага транзіту, нават калі замарозіць вайсковыя аб'яднанні з Расіяй.

У цэлым, Расія не пойдзе на крайнія меры канфрантацыі, якую б ступень нейтральнасці ні абрала Беларусь, бо Беларусь знаходзіцца заблізка ад Масквы. Расія заўжды будзе зацікаўленая ў наяўнасці на гэтым кірунку добрага суседа, а не слабага ці моцнага ворага.

Меры Масквы — адносны рост цэнаў на газ і/ці нафту, зніжэнне прэферэнцыйнасці ў гандлі не нанясуць фатальнае шкоды беларускай гаспадарцы. Рост цэнаў прывядзе да выгаднага росту энэргаэфектыўнасці. Харчовая прамысловасць пераарыентуецца на рынак ЕС. Аднак у кароткачасовай перспектыве Беларусь у пэўным сэнсе пацерпіць.

Было б своечасова, каб Беларусь мела гарантыі атрымання макраэканамічнай дапамогі ЕС для кампенсацыі часовых стратаў ад выхаду з расійскай прасторы.

Непадпісанне Мытнага саюза з Расіяй непазбежна прывядзе да прыцягнення Беларусі ў еўрапейскую эканамічную супольнасць. Насамрэч, адзін непастаўлены подпіс можа адкрыць перад нашай краінай унікальныя магчымасці.

СЦІСЛА

### Цана на аднапакаёўкі дабралася да $1500 за метр

Цана квадратнага метра жылля ў Мінску за месяц узрасла на $25. Цяпер яна складае $1399. Аднапакаёўкі яшчэ даражэйшыя. У іх квадратны метр каштуе $1500.

### У АМОНе створаны жаночы ўзвод

У палку міліцыі спецыяльнага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама створаны жаночы ўзвод з 16 чалавек. Пераважная большасць ваеннаслужачых — спартсменкі. Ёсць майстры спорту па тайландскім боксе, лёгкай атлетыцы, розных відах барацьбы. Задачы дзяўчат ад задач іх калег-мужчын у палку не розняцца. Акрамя таго, у іх функцыі ўваходзіць нагляд жанчын пры допуску на масавыя мерапрыемствы.

### Дэклараванне грашовых пераводаў з-за мяжы будзе часткова адмененае

Пра гэта паведаміла намеснік міністра па падатках і зборах Ларыса Кандратава. «Цяпер гучаць прэтэнзіі ад насельніцтва, асабліва ад пенсіянераў, якія атрымліваюць грашовым пераводам нязначныя сумы», — сказала яна. Плануецца вызначыць найбольшую суму пераводаў, якую можна атрымаць на працягу года без дэкларавання і падаткаў. Паводле яе слоў, «гэта будзе лічба з трыма нулямі».

**ЯМ, СМ**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Сурадзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Сурадзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

А.Т., Ірыне З. са Смалявіцкага раёна.
А.С. з Мінскага раёна.
Сяргею Ж. з Клецкага раёна.
Леакадзіі Н. з Валожынскага раёна.
Алe А. з Магілёва
Паўлу С. з Горацкага раёна.
У.Я. з Барысаўскага раёна.
Андрэю Н. з Полацка.
Адзе Р. з Шаркоўшчынскага раёна.
А.К. з Крупскага раёна.
С.Ц. з Маладзечанскага раёна.
Г.Л., Ігару С., А.Л., І.А., Г.Г., Алене М., В.К., А.Х., Н.Х., Ірыне С., Аляксандру Я., Юрыю Л., Віталю Ч., Таццяне Н. з Мінска.

# У Еўропе запатрабаваныя «майстры кампрамісаў»

Прэзідэнтам Еўрасаюза стаў бельгіец Херман ван Ромпей.



У Беларусі такога б прэзідэнтам не выбралі.

Выбары першага пастаяннага старшыні Рады Еўрасаюза праходзілі 19 лістапада ў Брусэлі. Сярод найбольш верагодных кандыдатур заняць пасаду прэзідэнта ЕС называліся былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тоні Блэр, кіраўнік урада Галандыі Ян-Патэр Балкенендэ, экс-прэзідэнт Латвіі Вайра Віке-Фрэйберге, былы прэм'ер Італіі Масіма д'Алема.

Тым не менш, яшчэ напярэдадні сустрэчы ў Брусэлі фаварытам выбараў стаўся малавядомы старшыня ўрада Бельгіі Херман ван Ромпей. Менавіта гэты 62-гадовы палітык аказаўся той кампраміснай фігурай, якая задаволіла ўсіх 27 членаў Еўрапейскага саюза.

Прэм'ер-міністрам Бельгіі ван Ромпей стаў год назад, але перад гэтым каралю краіны Альберту II давялося доўга ўгаворваць палітыка згадзіцца на пасаду. Ван Ромпей належыць да хрысціянска-дэмакратычнай партыі фламандцаў. На пасадзе прэм'ер-міністра яму атрымалася зменшыць напружанасць у краіне, якая існуе між дзвюма этнічнымі групамі — фламандцаў і валонаў. Новага прэзідэнта ЕС яшчэ называюць «майстрам кампрамісаў».

Да выканання сваіх абавязкаў ван Ромпей прыступіць з 1 студзеня 2010 года. Тэрмін ягонага прэзідэнцтва разлічаны на 2,5 года, з правам пераабрання.

Таксама з Новага года працу на пасадзе міністра замежных справаў Еўрасаюза пачне брытанская баранэса Кэтрын Эштан. Раней яна была еўракамісарам па гандлі.

У 1999 годзе Кэтрын Эштан атрымала пажыццёвы тытул баранэсы, а таксама месца ў Палаце лордаў брытанскага парламента. Амаль дзесяць гадоў працавала ў лейбарысцкім урадзе Вялікабрытаніі — у міністэрствах адукацыі, кансультацыйных справаў і юстыцыі. У 2006 годзе яна была названая «Палітыкам года» ў Вялікабрытаніі.

Пасада прэзідэнта і міністра замежных справаў Еўрасаюза з'явілася пасля таго, як прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаус, апошні з усіх кіраўнікоў краін ЕС, падпісаў Лісабонскую дамову. Раней старшынёй Рады Еўрасаюза быў прэм'ер-міністр ці прэзідэнт той краіны, якая старшынявала ў ЕС.

Прэзідэнт Еўрасаюза ў асноўным адміністрацыйная пасада, якая не мае выканаўчых функцый. Ван Ромпей будзе несці адказнасць за падрыхтоўку самітаў, выніковых справаздач, прэзентацыю Еўрасаюза за мяжой, выступаць ад імя аб'яднанай Еўропы.

У свой час дзяржсакратар ЗША Генры Кісінджэр пажартаваў: «Каму патэлефанаваць, каб даведацца меркаванне Еўропы?» Цяпер меркаванне Еўропы можна будзе даведацца ў канкрэтнага чалавека, але гэта зусім не значыць, што менавіта з ім перамовы будуць весці Барак Абама ці Дзмітрый Мядзведзеў.

Што датычыць Беларусі, то сам факт узмацнення супольнага стрыжня ў замежнай палітыцы Еўропы — гэта плюс. Раней палітыка ЕС у дачыненні да нашай краіны шмат у чым залежала ад краіны-старшыні. Безумоўна, што інтарэс да Беларусі падчас старшынства Швецыі ці Чэхіі ўзрастаў, але падаў, калі ЕС узначальвалі, напрыклад, Францыя ці Партугалія. Цяпер жа можна чакаць, што палітыка Еўрасаюза да Беларусі будзе больш роўнай.

**Зміцер Панкавец**

**Вызваліць палітвязняў, адмяніць візы**

На мінулым тыдні ў Брусэлі таксама прайшоў Форум грамадзянскай супольнасці краін—удзельніц «Усходняга партнёрства». Беларусь на гэтым мерапрыемстве прадстаўлялі 27 дзяржаўных і недзяржаўных грамадскіх арганізацый. Менавіта з падачы ўдзельніка беларускай дэлегацыі, прадстаўніка Асамблеі няўрадавых арганізацый Сяргея Мацкевіча была прынятая рэзалюцыя, якая заклікае вызваліць палітвязняў і адмяніць візы для грамадзян шасці краін (Беларусь, Украіна, Малдова, Грузія, Арменія, Азербайджан).

Якраз Мацкевіч быў абраны для выступу на саміце краін Еўрасаюза, што пройдзе ў снежні ў Стакгольме, каб данесці пазіцыю Форуму грамадзянскай супольнасці.

**Камунікабельны Козік**

На Форуме грамадзянскай супольнасці прысутнічаў старшыня дзяржаўнай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік. Прэс—сакратарка «Маладога фронту» Таццяна Шапуцька кажа, што Козік актыўна ішоў на кантакт з іншымі ўдзельнікамі дэлегацыі. «Адразу падышоў да нашага стала, сказаў, што тут сядзяць сапраўдныя беларусы. Раздаў усім свае візіткі і зазначыў, што будзе рады працягнуць з намі кантакт ужо ў Беларусі», — кажа Таццяна Шапуцька. Адзінае, што не спадабалася Козіку, гэта тое, што ўдзельнікаў наступных падобных Форумаў будзе вызначаць Еўракамісія. «А калі я хачу, каб тут прысутнічаў нехта, каго тут няма. Напрыклад, Аляксандр Мілінкевіч», — казаў старшыня ФПБ. Леанід Козік таксама шмат камунікаваў з палітыкам Алесем Міхалевічам, але галасаваў супраць прапановаў, якія ўносіў апазіцыянер.

## Аўтуховіча абвінавацілі ў тэрарызме

Прадпрымальніку з Ваўкавыска Мікалаю Аўтуховічу 18 лістапада ўсё ж выставілі абвінавачванні ў тэрарызме.

Яшчэ аднаму зняволенаму, Уладзіміру Асіпенку, падобныя абвінавачванні не высоўваюцца. Яго па-ранейшаму абвінавачваюць у знішчэнні маёмасці ваўкавыскіх чыноўнікаў.

Аўтуховіча вінавацяць у падрыхтоўцы тэракта супраць старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі, а таксама намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянко яшчэ восенню 2005 года. Па гэтай справе дзесьці ў Ваўкавыску быў знойдзены гранатамёт, з якім Аўтуховіч нібыта і рыхтаваў замах.

Сам Мікалай Аўтуховіч называе такія абвінавачванні абсурднымі. У турме ён трымаў рэкордную трохмесячную галадоўку. Прадпрымальнік кажа, што яму проста помсцяць.

Следства па справе падоўжанае да 8 снежня. Сябры Аўтуховіча лічаць, што судовы працэс па справе пройдзе пры зачыненых дзвярах.

Па словах праваабаронцы Алега Воўчака, гэта першы выпадак у Беларусі, калі судзяць за тэрарызм.

**ЗП**

## «Звязда» пачала пляжыць Расію

За апошні тыдзень дзяржаўная газета апублікавала тры вельмі крытычныя матэрыялы аб суседняй дзяржаве.

Артыкулы «Бедная багатая Расія», «Расія «заблыталася» ў карупцыі» і «Расійская міліцыя не ўпісваецца ў вобраз міхалкоўскага «Дзядзькі Сцёпы» выйшлі з інтэрвалам у некалькі дзён. Аўтарам усіх матэрыялаў з'яўляецца нейкі Ігар Рыгораў.

У першым са згаданых артыкулаў — «Бедная багатая Расія» — апісваецца жахлівы стан расійскай эканомікі. У прыватнасці, рост беспрацоўя: «Рэальная колькасць беспрацоўных можа скласці каля 10 млн чалавек... Бадай, самае непрыемнае ў гэтай сітуацыі тое, што простыя расіяне пакінутыя сам-насам з праблемай пошуку працы».

Апісанне эканамічных праблем нашага ўсходняга суседа «Звязда» дапаўняе матэрыяламі аб парушэннях адміністрацыйнага і крымінальнага заканадаўства. У артыкулах «Расія «заблыталася» ў карупцыі» і «Расійская міліцыя не ўпісваецца ў вобраз міхалкоўскага «Дзядзькі Сцёпы» Ігар Рыгораў піша пра «карупцыйны тупік», у якім апынулася сённяшняя Расія. «Звязда» цытуе маёра расійскай міліцыі Дымоўскага, які, зняверыўшыся ў справядлівасці расійскай выканаўчай улады, сказаў: «Пуціна я больш не лічу нармальным мужыком». І падае цалкам пазітыўны вобраз таго самага расійскага маёра.

Здзіўляе не пададзеная «Звяздой» інфармацыя. Расійская карупцыя і эканамічная адсталасць ні для каго не сакрэт. Цікава тое, што гэтыя артыкулы з'яўляюцца, нібы пад заказ, у кансерватыўным выданні, якое раней, разам з астатнімі дзяржаўнымі СМІ, выступала за інтэграцыю з Расіяй.

**Алесь Пілецкі**

### СЦІСЛА

**Берлусконі наведае Беларусь**

Кіраўнік італьянскага ўрада Сільвіё Берлусконі мае наведаць Беларусь 30 лістапада. «Усё гэта — адказ на візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Італію і Ватыкан у красавіку», — падкрэсліў пасол Італіі Джуліё Прыджоні.

**Ярмошына: няма грошай на відэазапіс падліку**

Таксама Цэнтравыбаркам не плануе маштабных закупак празрыстых скрыняў для галасавання, паведаміла Лідзія Ярмошына.

**ЗП**

### КАЛЯНДАР

**Дзень герояў 27 лістапада**



У выніку падпісання Рыжскай дамовы аб межах паміж Расіяй, Польшчай і Украінай, Слуцк трапіў у нейтральную зону. Палякі адышлі, а саветы не паспелі заняць горад. Гэтым і скарысталіся нацыянальныя сілы.

Рада Случчыны абвесціла тэрыторыю зонай улады БНР. Пад яе сцяг адразу ўстала 4 тысячы сялянаў і інтэлігентаў. Быў створаны Першы Слуцкі полк на чале з падпалкоўнікам Паўлам Чайкай і Другі Грозаўскі полк на чале з капітанам Лукой Семянюком.

Баі супраць бальшавікоў ішлі ўвесь снежань. Паўстанне засталося ў гісторыі як геройскі выступ за незалежнасць Беларусі. З таго часу 27 лістапада ў нацыянальнай традыцыі святкуецца як Дзень герояў.

**АП**

# «МКАД-2» — Другая кальцавая нагадвае сэрца

**Другая кальцавая адфільтруе іншагародніх кіроўцаў і стане часткай Балта–Чарнаморскага шляху.**

Генеральны план развіцця Мінска да 2030 года, над якім працавалі 25 праектных інстытутаў, ухвалены кіраўніком дзяржавы. За час падрыхтоўкі праекта ў Мінгарвыканкама паспеў змяніцца старшыня. Замест захварэлага Міхаіла Паўлава абавязкі мэра стаў выконваць Мікалай Ладуцька. Істотных зменаў у праект новы начальнік не ўнёс.

### Свабода ад аўто і аўтамабілістаў

Жаданне зрабіць цэнтр Мінска пешаходным прымае ўсё большыя маштабы. Апроч вуліц Маркса і Камсамольскай, чыноўнікі замахнуліся на Верхні горад. Мяркуецца, што раён плошчы Свабоды будзе цалкам вызвалены ад аўтамабіляў.

Кіраўнік дзяржавы высунуў арыгінальную прапанову — абмежаваць уезд у сталіцу іншагародніх аўтамабіляў. На яго думку, будзе лепш, калі госці сталіцы пакінуць свае машыны на ўездзе ў горад і пасуць на грамадскім транспарце.

### Закальцуюць

Вакол Мінска плануецца пабудаваць другую кальцавую дарогу. Спачатку будзе пабудаваны ўчастак працягласцю 50 кіламетраў, які злучыць брэсцка-берлінскую і віленскую трасы. Прычым рабіць будуць самы сапраўдны аўтабан. Пасля чарга дойдзе да астатніх участкаў, і Мінск закальцуюць з усіх бакоў. Лагістычныя цэнтры будуць найбольш набліжаныя менавіта да другога кола.

Колы будуць і ўнутры сталіцы. Два з іх амаль скончаныя. А вось трэцяе яшчэ будаваць і будаваць. Праўда, яго якраз-такі і не закальцуюць. Праблема знайшлася ў Паўднёвым захадзе. Праспект Любімава прывядзе ў тупік.

### Жыллё ў Заслаўі і Смалявічах падаражэе

У бліжэйшы час цэны на жытло ў гарадах-спадарожніках Мінска ўзрастуць. Дзяржава збіраецца ўкласці грошы ў іх развіццё. У першую чаргу, у Заслаўе і Смалявічы. Далей прыйдзе чарга Лагойска з Дзяржынскам.




Перад прыростам насельніцтва ў Мінску будзе пастаўлена заслона — двухмільённы жыхар беларускай сталіцы не патрэбны. Зараз ў Мінску жыве больш за 1,8 мільёна чалавек, і ў год павінна дадавацца не больш за 5 тысяч.

### Чарговы перагляд

Старшыня камітэта па горадабудаўніцтву Мінгарвыканкама Віктар Нікіцін у чарговы раз паспрабаваў расставіць кропкі над «і» ў пытанні сталічных хмарачосаў. Хутчэй за ўсё, «Кемпінскі» канчаткова змяніў планы. Праект хмарачоса на Кастрычніцкай плошчы пераўтварыўся ў комплекс невысокіх — сем паверхаў — офісных будынкаў.

Гатэль «Беларусь» пакінуць у спакоі, але побач з ім узвядуць больш высокую прыбудову з верталётнай пляцоўкай на даху. «Мінск-сіці» на месцы аэрапорта, «Маяк Мінска» каля Нацыянальнай бібліятэкі — тут усё па-ранейшаму.

### «Трактар» — галоўны стадыён краіны

У Мінску ў 2013 годзе замест цяперашняга стадыёна «Трактар» з'явіцца новая арэна на 45 тысяч месцаў з закрытымі ад дажджу трыбунамі. Стадыён стане найбуйнейшым у краіне. Пасля яго адкрыцця пачнецца рэканструкцыя «Дынама». З яго тэрыторыі выкінуць намёты з турэцкім адзеннем, а вакол пабудуюць гатэлі.

Чарговы новы выгляд атрымала «Чыжоўка-арэна». Ужо чацвёрты праект, можа, стане апошнім.

Варта ўдакладніць, што генеральны план Мінска знаходзіцца ў працэсе пастаянных змен — трэба ж даваць працу тым самым дваццаці пяці праектным інстытутам. Праз два гады чакаецца чарговае ўдакладненне з расстаноўкай прыярытэтаў. Некаторыя інвестары адмовяцца ад фінансавання, і ім прыйдзецца шукаць замену.

**Ягор Марціновіч**

# Гарналыжны цэнтр у Мінску

У Курасоўшчыне адкрылася гарналыжная траса.

Яна знаходзіцца ў раёне вуліцы Казінца. Траса будзе ўваходзіць у склад комплекса «Сонечная даліна», які пакуль што складаецца з трох схілаў для заняткаў гарналыжным спортам і сноўбордам, табаганаў і цюбінгаў.

Незразумелае для беларусаў слова «табаган» абазначае своеасаблівыя амерыканскія горкі — рэйкавую трасу, па якой вазкі рухаюцца дзякуючы вазе людзей. Даўжыня табагана — 430 метраў атракцыёна пралятаюць на хуткасці каля 40 км/г. Цюбінгі — надзіманыя санкі, на якіх можна спусціцца па снежным жолабе.

Да Калядаў з'явяцца яшчэ і схілы для гарналыжнікаў і сноўбардыстаў. Калі не будзе снегу, запрацуюць снежныя пушкі, якія пакрыюць трасы штучным снегам.

Грошы на будаўніцтва выдаткаваў гарадскі бюджэт.

**ЯМ**


БЕЛАПАН

**«Гарналыжны спорт робіцца даступным для ўсіх катэгорый насельніцтва», — заявіла старшыня гарналыжнай федэрацыі і намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч на адкрыцці.**


БЕЛАПАН

**Траса знаходзіцца над далінай Лошыцы.**


БЕЛАПАН

**Табаган — гэта рэйкавая траса.**

# Другі гіпермаркет Чыжа

У Мінску адкрыўся другі гіпермаркет ProStore.

Ён будзе працаваць у мікраёне Шабаны па адрасе Партызанскі праспект, 182.

Інвестарам аб'екта выступіла ТАА «Трайпл». Ягоны кіраўнік Юрый Чыж мае вялікія планы наконт стварэння вялікіх крамаў у сталіцы. У найбліжэйшы час адкрыецца яшчэ адзін гіпермаркет ProStore ў мікраёне Чыжоўка.

За іншай кампаніяй Юрыя Чыжа, СЗАТ «Альтэрсалюшнс», таксама замацаваныя некалькі пляцовак пад гандлёвыя цэнтры. У тых самых Шабанах і ў Каменнай Горцы.

Апроч вялікіх крамаў, Чыж звярнуў увагу і на фармат «крамкі каля дома». Пад брэндам MiniStore плануецца стварэнне сеткі з 100-120 дыскаўнтэраў ва ўсёй Беларусі.

Цяпер у Мінску працуюць пяць гіпермаркетаў — два ProStore, Gippo, Bigzz і «Карона» і гіпердыскаўнтэр «Еўраопт».

**ЯМ**

## СЦІСЛА

### Скайп прадалі за $2,75 млрд

Інтэрнэт-аўкцыён eBay прадаў сэрвіс галасавой і відэасувязі Skype. Падчас угод Skype ацанілі ў $2,75 млрд. Фундатарам, узначаленым кампаніяй Silver Lake Partners, будзе належаць 70% кампаніі. Астатнія 30% застануцца ў інтэрнэт-аўкцыёна.

Skype — адна з найбуйнейшых сетак інтэрнэт-сувязі. Зараз у ёй налічваецца 521 мільён уліковых запісаў.

### Беларускім малочным прадуктам адкрыта акно ў Еўропу

Верхнядзвінскі масласырзавод першым у краіне атрымаў сертыфікат адпаведнасці патрабаванням Еўрасаюза па якасці і бяспечнасці прадукцыі — цвёрдых і паўцвёрдых сыроў.

### Мінімальны кошт гарэлкі

Камісія ўрада Расіі па рэгуляванні алкагольнага рынку прыняла рашэнне, згодна з якім мінімальная цана на 0,5 л гарэлкі складзе 89 рублёў. Гэта 8500 беларускіх рублёў у эквіваленце. Рашэнне ўступіць у сілу з 1 студзеня 2010 года.

Мяркуецца, што ўвядзенне мінімальнай цаны на гарэлку дазволіць выцесніць з рынку нелегальную гарэлку, якая каштуе ад 40 да 60 рублёў.

### Капсульны гатэль

У маскоўскім аэрапорце «Шарамецьцева» адкрылі капсульны гатэль. У гатэлі, які размешчаны ў адным з тэрміналаў, ёсць 66 нумароў плошчай ад 7,5 да 22 квадратных метраў. Кошт пражывання складае 40 даляраў за 4 гадзіны.

### Стаўка рэфінансавання — 13,5%

Нацбанк прыняў рашэнне пра зніжэнне з 1 снежня стаўкі рэфінансавання з 14% да 13,5% гадавых. Услед за гэтым прыкладна на столькі ж паменшацца працэнты па крэдытах і ўкладах. Нацбанк плануе і надалей памяншаць стаўку рэфінансавання.

### Згулялі на курсах

Іран зарабіў 5 мільярдаў даляраў на пераводзе рэзерваў краіны ў еўра. У верасні прэзідэнт Ірана загадаў адмовіцца ад даляра.

**ЯМ**

# «Мы не заўважылі, як падышла смерць»

Працяг са старонкі 1.

«Мы жылі з бацькамі Сяргея. Яго маці і бацька, вельмі клапатлівая жанчына, сама звязаная з медыцынай і добра ведае, як і што лячыць. У пятніцу 30 кастрычніка Сяргей без дай прычыны пачаў моцна кашляць, — узгадвае Алеся. — Нават не ведаю, дзе і калі прыстала да яго гэтая хвароба. Можа ў транспарце. Яму было дрэнна, але ніхто з нас не адчуў сапраўднай небяспекі, падумалі, што гэта звычайная прастуда, якая часта з усімі здараецца. Тым не менш, на наступны дзень мы выклікалі хуткую, дактары зрабілі ўкол і прапісалі медыкаменты.

Яны выглядалі стомленымі, можа, таму так спакойна сказалі: «Хочаце, забярэм яго ў бальніцу?». Можа іх тон, можа тое, што майму мужу зрабілі ўкол, нас так супакоіла... Паўтару, мы не адчулі небяспекі... дый Сярожка хацеў лепш застацца дома...» — працягвае дзяўчына.

За выхадныя стан Сяргея пагоршаў. У панядзелак родныя выклікалі ўчастковага доктара, якая прапісала яшчэ медыкаменты. У той жа дзень Алеся, калі была на працы, адчула, што пачынае дрыжаць, і зразумела, што таксама захварэла. Яна паехала да сваёй мамы, каб нанова не заразіць мужа, дый свякрусе не прыйшлося клапаціцца і аб ёй, і аб Сяргеі. «Я падумала, што ў мяне толькі пачатак хваробы, а ён ужо выздараўлівае», — расказвае Алеся. Больш мужа яна не ўбачыла...

### Рэанімацыя

Як вядома, вірусная пнеўманія развіваецца літаральна за некалькі дзён. Так адбылося і ў гэты раз. У аўторак Сяргея на хуткай дапамозе забралі ў бальніцу. У яго быў настолькі цяжкі стан, што яго адразу ж накіравалі ў рэанімацыю і падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх.

Неўзабаве стала дрэнна і свякрусе, але яна мужна трымалася, бо... сын! Думка была толькі пра сына. Яна з дачкой Таццянай, сястрой Сяргея, абтэлефанавалі ўсіх знаёмых, што мелі дачыненне да медыцыны, выпытвалі лепшыя лекі, якімі можна было б папраўіць здароўе дарагому чалавеку, прапанoўвалі іх дактарам.

«Мы кожны дзень званілі ў бальніцу, літаральна праз паўгадзіны, баяліся, каб дактары не падумалі, што ён нікому не патрэбны... Лекары пачалі нават злавацца, і мы зразумелі, што адцягваем іх увагу ад яго ж, — кажа Алеся. — Мы ездзілі і ў царкву, ставілі свечкі, пісалі паперкі за здароўе...»

Тым часам Галіне Філіпаўне стала горш. Яе паклалі ў тую ж бальніцу, што і сына, праўда, у звычайнае аддзяленне, а не ў рэанімацыю. Як і ў Сяргея, у яе знайшлі двухбаковае запаленне лёгкіх. Барацьбу за яго жыццё працягвалі тыя, хто застаўся: Таня, бацька Аляксандр Апанасавіч, жонка Алеся. «Я была на бальнічным, — кажа Алеся Коршак.



— Мне паставілі дыягназ трахеіт, як і Сяргею ў пачатку хваробы, але я таксама ездзіла ў бальніцу ў павязцы. Пакуль магла, бо мне станавілася горш...»

### «Гэты вечар для яго ўжо можа не наступіць...»

Калі яна сказала, што ў сям'і хвараюць яшчэ два чалавекі, яе адправілі на рэнтген. У Алесі знайшлі правабаковае запаленне лёгкіх і далі накіраванне ў бальніцу з адкрытай датай, бо сітуацыя з Сяргеем станавілася ўсё цяжэйшай.

«Калі я патэлефанавала ў бальніцу ў нядзелю, 8 лістапада, доктар сказаў, што гэты вечар для Сяргея можа ўжо не наступіць... Мы зноў пабеглі ў царкву і былі там дапазна, вырашылі не званіць як мага даўжэй, бо было так страшна», — успамінае той трагічны дзень жонка.

Калі ўвечары, а было каля 21.00, Алеся зноў пазваніла, ёй сказалі, што ў мужа пачалося спыненне сэрца і яго рэанімуюць.

«У наступны раз слухаўку ўзяла медсястра і сказала, што ўжо ўсё...» — узгадвае Алеся.

«Я не магла паверыць, я не магу да канца гэтага ўсвядоміць... Ён пратрымаўся амаль да 9-й вечара...»

Прычынай смерці Сяргея стаў не грып і не пнеўманія — сардэчна-лёгачная недастатковасць.

### У неўралогію, бо ў пульманалогіі не хапала месцаў

Стан Галіны Філіпаўны быў настолькі дрэнным, што на пахаванне сына яе не пусцілі. Адразу пасля пахавання ў бальніцу лягла і сама Алеся. Яе паклалі ў аддзяленне неўралогіі, бо ў пульманалогіі не хапала месцаў.

У бальніцы яна прабыла да 20 лістапада, таму на памінкі праз дзевяць дзён пасля смерці мужа трапіць не здолела. Дзякуй богу, яе хвароба паддалася лячэнню, і жанчына ўжо выйшла на працу.

У панядзелак, 23 лістапада, з рэанімацыі ў звычайнае аддзяленне перавялі Галіну Філіпаўну. Яе стан палепшаў.

**P.S.** Алеся не была побач са сваім мужам, калі яго забіралі ў бальніцу, таму папрасіла магчымасць сказаць яму апошнія словы праз нашу газету:

«Сярожа, даражэнькі мой, дзякуй табе за маё шчасце з табою, за усё, што ты дзеля мяне зрабіў, за тваю дабрыню, павагу і пяшчоту. Я цябе ніколі не забуду...»

**Ягор Марціновіч**

### «Мой дзядзька памёр ад пнеўманіі, а напісалі — ад інфаркту»

Ранняя эпідэмія грыпу ў гэтым годзе напачатку суправаджалася маўчаннем афіцыйных асобаў. Як вынік, простыя грамадзяне сілкаваліся чуткамі ды гісторыямі, апісанымі ў блогах. «У графе «прычына смерці» ў майго дзядзькі, які памёр у Мінску пазамінулай ноччу, напісалі «інфаркт». Хоць ён памёр ад пнеўманіі, выкліканай грыпам», — напісаў у блогу Pgrigas.

Гэтая і падобныя ёй гісторыі сталі адным з сімвалаў першай атакі «свінога» грыпу на Беларусь.

### Драмы эпідэміі

Драматычная гісторыя здарылася ў Мінску. Ад пнеўманіі памерла 23-гадовая дзяўчына Н. Яна была адна ў бацькоў, а яе бацька — цяжка хворы...

## Пульманолаг: Праблема ў тым, што на пнеўманіі, ускладненыя вірусам свінога грыпу, не дзейнічаюць звычайныя антыбіётыкі

Вядучы спецыяліст НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі, які непасрэдна займаецца кансультаваннем цяжкіх выпадкаў запаленняў лёгкіх, распавёў радыё «Свабода», у чым асаблівасці пнеўманіі, якая выклікаецца вірусам свінога грыпу.

«Вірус A/H1N1 не абавязкова прысутнічае пры кожным захворванні на пнеўманію, але ў цяжкіх выпадках ён выклікае двухбаковую пнеўманію. І калі пнеўманія ўжо развілася, у прынцыпе, лячыць яе вельмі складана. Верагоднасць вылечвання невельмі высокая».

Звычайна 80% усіх пнеўманій выкліканыя пнеўмакокам — мікробам. І супраць яе эфектыўна дзейнічаюць антыбіётыкі. Што да пнеўманій, якія ўскладненыя вірусам A/H1N1, то звычайныя антыбіётыкі тут не дапамагаюць.

Доктар лічыцца аўтарытэтам у сваёй сферы, яго запрашалі на кансультацыі ў Брэст, Віцебск, у Бараўляны. Ён расказвае, што літаральна ва ўсёй краіне іншыя аддзяленні перапрафіляваныя пад пульманалогіі, літаральна ўсе рэанімацыі запоўненыя хворымі на пнеўманію, занятыя ўсе апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх.

Ахвярамі незвычайнай пнеўманіі становяцца ў асноўным маладыя людзі: «Бальшыня былі — маладыя цяжарныя жанчыны, 21-25 тыдняў цяжарнасці. Спачатку тэмпература, кашаль, потым чалавеку робіцца цяжка дыхаць. З тых, каго я назіраў, выжыла няшмат... З дзесятка двое выжыла».

Доктар падкрэсліў: не трэба з гэтага рабіць высновы, што бальшыня хворых асуджана на смерць. Проста яго выклікаюць на кансультацыі ў асабліва складаных выпадках.

## Ранняя эпідэмія заспела беларусаў знянацку

Ахвярамі выкліканай ёй хуткацечнай пнеўманіі рабіліся часцей за ўсё працаздольныя людзі да 60 гадоў, асобы з празмернай вагой, цяжарныя. А вось людзі сталага веку, на чый век прыпалі ранейшыя эпідэміі, пераносяць «свіны» грып лягчэй. Яшчэ адным адкрыццём стала тое, што некаторыя айчынныя лекі малаэфектыўныя супраць «свінога» грыпу. Раптоўная эпідэмія выявіла надзвычай нізкую інфармаванасць насельніцтва.

Шмат хто з простых грамадзянаў не разумее розніцы паміж сезонным і «свіным» грыпам. Звычайны грып пачынаецца з галаўнога болю, болю ў вачах, высокай тэмпературы; «свіны» — з рэзкага кашлю, часта з крывёй, праблемаў страваванне, а ўжо потым з'яўляюцца высокая тэмпература, насмарк і галаўны боль.

Не ведаюць многія і таго, што пнеўманія з'яўляецца наступствам грыпу, яго ўскладненнем. Напалоханыя чуткамі і адсутнасцю інфармацыі, людзі паддаліся паніцы і кінуліся змятаць з паліцаў аптэк усё — ад вітамінаў да марлевых павязак.

Усяго за па стане на аўторак у Беларусі было лабараторна пацверджана 179 выпадкаў захворвання на пандэмічны грып A/H1N1. Але ўсе выпадкі не фіксаваліся, таму дакладнай лічбы няма. Увогуле, Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе абвяшчаць эпідэмію пры наяўнасці нават аднаго лабараторна пацверджанага эпізоду. Усяго на грып і ВРВІ з 1 кастрычніка па 16 лістапада захварэла каля 602 тысяч чалавек. Афіцыйна паведамляецца пра 19 памерлых ад пнеўманіі, з іх 13 чалавек хварэлі на грып A/H1N1.

**Сямён Печанко**

**У бліжэйшых нумарах «НН» працяг гісторыі** — Галіна Філіпаўна хоча распавесці сваю гісторыю. Жанчына прайшла праз рэанімацыю і можа расказаць, якая сітуацыя зараз у мінскіх бальніцах.

Калі і яшчэ хто з чытачоў мае расказаць свае сутыкненне з эпідэміяй, калі ласка, звязвайцеся з Рэдакцыяй: тэл. **(017) 284-73-29**, **(029) 613-32-32**, **(029) 707-73-29**. E-mail: **nn@nn.by**

Гэта трэба, каб грамадства зрабіла высновы з эпідэміі-2009.

# Навумаў супраць Лукашэнкі

**У беларускім хакеі скандал. Галоўны трэнер нацыянальнай каманды быў прызначаны Міністэрствам спорту і турызму, у абыход Беларускай хакейнай федэрацыі. Навумаў з такім развіццём падзей катэгарычна не пагаджаецца.**

Настаўнікам зборнай стаў 47-гадовы Міхаіл Захараў, які ўзначальвае мінскае «Юнацтва». Аказалася, што Захараў проста «самавылучыўся» і Міністэрства падтрымала ягоную кандыдатуру. Незадоўга да гэтага беларус таксама стаў трэнерам Украіны.

Вакантным месца за стырном зборнай аказалася пасля адстаўкі канадскага спецыяліста Глена Хэнлана. Старшыня федэрацыі, былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў адразу пачаў пошук зменшчыка. Прычым сярод замежнікаў, бо ўсе беларусы занятыя ў клубах, так ён растлумачыў.

Сярод найбольш імаверных кандыдатур разглядаўся чэх Уладзімір Вуйтэк. Ягоны сын, які адначасова з'яўляецца агентам, кажа: «Бацька быў ужо адной нагой у Беларусі. Ён вельмі хацеў папрацаваць са зборнай, яго вабіла магчымасць удзелу ў Алімпійскіх гульнях. Мы правялі перамовы з федэрацыяй і фактычна дамовіліся аб усім. Канчатковае рашэнне адклалі на пару дзён. На жаль, выбар быў зроблены на карысць Захарава».

Мала хто сумняваецца, што вырашальнае слова ў прызначэнні Захарава належыць «галоўнаму хакейнаму балельшчыку» краіны. Новы трэнер зборнай ганяе шайбу ў хакейнай камандзе Аляксандра Лукашэнкі. Нярэдка Захарава бачылі ў адной кампаніі з сынамі кіраўніка краіны. У сваім перадвыбарчым выступе ў 2006 годзе Аляксандр Казулін расказваў, што сын Лукашэнкі Віктар у свой час страляў у Захарава з пісталета ў адным з начных клубаў Мінска.

Міхаіл Міхайлавіч ужо трэніраваў зборную, але быў вымушаны пакінуць яе пасля правальнай рыжскай кваліфікацыі да Алімпіяды ў лютым 2005 года. Яшчэ ў трэцім перыядзе нашы хлопцы выйгравалі ў латышоў з лікам 4:2, але цягам некалькіх хвілін умудрыліся прапусціць тры шайбы. Галоўная памылка Захарава была ў тым, што ён не ўзяў тайм-аўт, не даў хакеістам аддыхацца. Тады на змену Захарава і прыехаў Глен Хэнлан.

Цяжка сказаць, калі дакладна прабегла чорная котка паміж Уладзімірам Навумавым і Міхаілам Захаравым. Нейкіх дробных сутычак хапала заўсёды. Захараў хацеў, каб ягонае «Юнацтва» прадстаўляла Беларусь у Кантынентальнай лізе, але выбар быў зроблены на карысць праекта Навумава — мінскага «Дынама».

«Я вельмі паважаю Міхаіла Міхайлавіча за неабыякавасць і гатоўнасць спрачацца. Гэта добра для справы, горш, калі з табой усе пагаджаюцца. Але іншы раз у Захарава словы апярэджваюць думкі», — зазначыў у адным з апошніх інтэрв'ю У.Навумаў.

Калі Міністэрства спорту і турызму звярнулася з просьбай зацвердзіць Захарава галоўным трэнерам зборнай, то федэрацыя зрабіць гэта адмовілася. Ніхто з прадстаўнікоў ведамства Навумава не прыйшоў на прэзэнтацыю новага настаўніка.

Не было прозвішча Захараў і ў спісе, які федэрацыя падавала ў Міністэрства для зацвярджэння, на Алімпійскія гульні ў Ванкуверы.

Прадстаўнікі Міністэрства кажуць, што не парушылі закон. Бо прызначэнне адбывалася са згоды Нацыянальнага алімпійскага камітэта. А менавіта пры дапамозе пастаяннай камісіі па працы з федэрацыямі па відах спорту. Яе ўзначальвае кіраўнік БФСА «Дынама» Юры Бародзіч. Пра ягоныя напружаныя адносіны з Навумавым таксама добра вядома.

Бародзіч кажа, што хакейнае «Дынама» выкарыстоўвае іхні брэнд і не плаціць за гэта грошы, а Навумаў — што выстаўленыя рахункі неадэкватна вялікія. Менавіта з гэтай мэтай на майках гульцоў каманды было напісана ні па-беларуску, ні па-расійску, ні па-англійску, а на дзіўнай трасянцы — «Дінамо» (Мінск).

Захараў кажа, што адзіным чалавекам, які яго не павіншаваў з прызначэннем, застаецца Навумаў. Тым не менш, аўтарытэтныя беларускія спецыялісты Уладзімір Крыкуноў і Аляксандр Андрыеўскі дапамагаць Захараву ў зборнай адмовіліся.

За гады працы з мінскім «Юнацтвам» Захараў даказаў, што ён добры спецыяліст. Чатыры разы выйграваў першынства краіны, Кантынентальны кубак, вырасціў шмат гульцоў для зборнай. Тым не менш, у хакейным асяроддзі яго не надта любяць праз складаны характар і выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурсу.

Апытанні на вядучых спартовых сайтах, як дзяржаўных («Спортивная панорама»), так і недзяржаўных («Прессбол»), сведчаць, што прызначэнне Захарава балельшчыкі ўспрымаюць у штыхі. І ўсе спадзяванні на змену сітуацыі звязаныя акурат з персонай Навумава, які проста так здавацца не збіраецца.

Тым часам да Алімпіяды ў Ванкуверы застаецца менш за тры месяцы.

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Захараў даўно не сябруе з Навумавым.**

FREEВОЛЬНАСЦІ

## Пакуты Месаліны, альбо Сэкс падчас чумы

Валерыя Месаліна, вядомая німфаманка сусветнай гісторыі, магла б мець сур'ёзныя праблемы, калі б жыла ў сёлетнюю восень. Нягледзячы на тое, што некаторыя беларускія медыкі рэкамендуюць актыўна займацца сэксам падчас эпідэміі грыпу, многія беларусы проста панічна баяцца выконваць гэтую няхітрую параду эскулапаў. Тым больш, што самі медыкі сваіх парадаў не выконваюць.



Быў у мяне адзін знаёмы, студэнт старэйшых курсаў медуніверсітэта і прыхільнік даследаванняў нямецкіх дактароў. А нямецкія дактары падчас эпідэміі грыпу вывелі наступную тэорыю: падчас грыпу трэба ад сэксу ўстрымацца! Аўтар тэорыі прафесар Ханс Шэрар не адмовіў карыснага ўздзеяння сэксу на арганізм, але (!) адзначыў, што палавым шляхам заражэнне вірусам амаль напэўна адбываецца.

Самае цікавае, што прафесар Шэрар не забараніў цалавацца. Маўляў, падчас пацалункаў адбываецца менш актыўны працэс абмену вірусам, чым падчас непасрэднага палавога кантакту. Таму падчас эпідэміі — толькі пацалункі і болей «ні-ні». Дык вось, мой знаёмы студэнт-медык вырашыў апрабаваць «тэорыю ўстрымання» на практыцы. Дзяўчына ягоная, праўда, такога клопату пра здароўе не зразумела. Не ведаю, ці пакутавала яна на комплекс Месаліны, але пацалункі яўна не адпавядалі ейнаму тэмпераменту, і яна кінула студэнта-небараку. Дарэчы, на грып студэнт такі захварэў.

Сёлетняя эпідэмія свінога грыпу наогул падклала ў пасцелі многіх пар тлустую свінню. Мужчыны ў прынцыпе больш за жанчын панікуюць з нагоды розных хвароб. Невялікі боль у горле — і 80% мужчынаў цалкам бездапаможныя. Які тут сэкс?! А калі боль у горле і насмарк у вас, жанчыны, — будзьце спакойныя, штоноч вы будзеце ціхенька ляжаць на сваёй палавіне ложка, захутаныя ў пуховую коўдру па самыя вушы.

Як па мне, лепш захварэць ад любімага чалавека, чым ад выпадковага пасажыра ў метро, які на вас чхнуў з усяго дуру. Падзялюся з вамі адной сакрэтнай парадай. Калі ў вас паднялася тэмпература і баліць горла, клічце свайго мужчыну або жанчыну, кладзіце на жывот гарошыну паболей і… да поўнага рашчаплення. У якасці прэлюдыі можна выбраць лячэбныя расціранні, а далей — інтуіцыя і народная медыцына падкажуць, што рабіць. І нават калі вы і хворыя на свіны грып, у вас як мінімум з'явіцца шчаслівая перспектыва памерці са сваім каханым ў адзін дзень.

**Вольга Жарнасек**

СЦІСЛА

### Кватарант забіў старэнькую гаспадыню

23-гадовы хлопец неяк прыйшоў позна ўвечары з чарговай гулянкі ды прапанаваў гаспадыні выпіць. Тая пачала маладога чалавека «вучыць жыццю». Апошняга гэта прывяло ў шал, і ён жанчыну збіў. Тая павалілася на канапу і пачала сіпець. А маладзён стукнуў дзвярыма і сышоў. Вярнуўся толькі на наступны дзень і пабачыў, што гаспадыня мёртвая.

Кватарант быў раней асуджаны за рабаванне, хуліганства і махлярства. Ён змешчаны ў ізалятар.

### Нажом каханаму акурат туды

У Радашковічах (Маладзечанскі раён) 26-гадовая жанчына падчас сваркі ўдарыла свайго 27-гадовага сабутэльніка нажом у пахвіну. Паранены мачавы пузыр. Вядзецца следства.

### Кампенсацыя за затрымку самалётнага рэйса больш чым на тры гадзіны складзе 600 еўра

Гэтая норма будзе дзейнічаць у Еўрасаюзе. Так пастанавіў Еўрапейскі суд. На такую ж кампенсацыю пасажыры могуць разлічваць у выпадку поўнай адмены рэйса. Кампенсацыя не плаціцца, калі затрымка выклікана надвор'ем і іншымі «надзвычайнымі акалічнасцямі», да якіх не адносіцца, напрыклад, паломка самалёта.

Згодна з правіламі, што існавалі дагэтуль, у выпадку затрымкі рэйса менш чым на пяць гадзін пасажыры маглі разлічваць на абед, бясплатнае тэлефанаванне і нумар у гатэлі. Грошы за білет вярталіся, калі вылет быў затрыманы больш чым на пяць гадзін.

**БЕЛТА; «Рэгіянальная газета»; БелаПАН**

# «Дадзенае паведамленне не адпавядае сапраўднасці...»



МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл. (017) 203 92 31, факс (017) 203 34 35

МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел. (017) 203 92 31, факс (017) 203 34 35

« » ................ № ................
на № ................

**Папярэджанне**
**юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты “Наша ніва”,**
**аб парушэнні артыкула 34 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі”**

“16” лістапада 2009 г. №12

Сутнасць парушэнння (кароткі змест):

У адпаведнасці з артыкулам 34 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі” журналіст сродку масавай інфармацыі абавязаны правяраць сапраўднасць атрыманых ім звестак для распаўсюджвання дакладнай інфармацыі.

У нумары 41 газеты “Наша ніва” за 4 лістапада 2009 года ў артыкуле “Замоўчванне грыпу выклікала эпідэмію панікі” паведамляецца, што “па стану на пятніцу, 30 кастрычніка, у краіне зафіксавала 39 смерцяў, з іх 9 у Мінску, ад пнеўманіі’.

Паводле пісьма Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 12 лістапада 2009 года, накіраванага Міністэрству інфармацыі, дадзенае паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

На падставе вышэйпададзенага, кіруючыся пунктам 1 артыкула 49 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі” Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь папярэджвае юрыдычную асобу, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі, – прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства “Суродзічы” аб недапушчальнасці парушэння артыкула 34 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі”.

Парушэнне Закона неабходна ліквідаваць у дзясяцідзённы тэрмін, аб чым паведаміць Міністэрству інфармацыі ва ўстаноўленым парадку.

Міністр У.В.Русакевіч

16 лістапада на адрас Рэдакцыі газеты «Наша Ніва» Міністэрствам інфармацыі быў накіраваны дакумент наступнага зместу:

**ПАПЯРЭДЖАННЕ**

**юрыдычнай асобе, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі газеты «Наша ніва»,**
**аб парушэнні артыкула 34 Закона Рэспублікі Беларусь**
**«Аб сродках масавай інфармацыі»**

«16» лістапада 2009 г. № 12

Сутнасць парушэння (кароткі змест):

У адпаведнасці з артыкулам 34 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» журналіст сродку масавай інфармацыі абавязаны правяраць сапраўднасць атрыманых ім звестак для распаўсюджвання дакладнай інфармацыі.

У нумары 41 газеты «Наша Ніва» за 4 лістапада 2009 года ў артыкуле «Замоўчванне грыпу выклікала эпідэмію панікі» паведамляецца, што «па стане на пятніцу, 30 кастрычніка, у краіне зафіксавана 39 смерцяў, з іх 9 у Мінску, ад пнеўманіі».

Паводле пісьма Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 12 лістапада 2009 года, накіраванага Міністэрству інфармацыі, дадзенае паведамленне не адпавядае сапраўднасці.

На падставе вышэйпададзенага, кіруючыся пунктам 1 артыкула 49 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь папярэджвае юрыдычную асобу, на якую ўскладзены функцыі рэдакцыі, — прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Суродзічы» аб недапушчальнасці парушэння артыкула 34 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі».

Парушэнне Закона неабходна ліквідаваць у дзесяцідзённы тэрмін, аб чым паведаміць Міністэрству інфармацыі ва ўстаноўленым парадку.

**Міністр У.В.Русакевіч**

Парадокс сітуацыі ў тым, што ў абгрунтаванні папярэджання міністр спасылаецца на пісьмо Міністэрства аховы здароўя, між тым матэрыялы, апублікаваныя ў газеце, акурат і даказвалі, што Міністэрства аховы здароўя не дае поўнай і дакладнай інфармацыі пра санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю ў краіне, колькасць выпадкаў захворвання на свіны грып і пнеўманію, у тым ліку з лятальным зыходам.

Нагадаем, што па стане на 3 лістапада, дзень здачы нумара ў друк, галоўная санітарная доктарка краіны адмаўляла наяўнасць смяротных выпадкаў у выніку ўскладнення вірусных інфекцый. Між тым, на момант здачы нумара ў друк незалежныя СМІ мелі копіі вынікаў медыцынскіх экспертыз аб прычынах смерці людзей, дзе чорным па белым было пазначана, што яны памерлі ад крайне цяжкай формы пнеўманіі і ў памерлых была выяўлена РНК віруса грыпу A/H1-swine. Дарэчы, копія аднаго з такіх данясенняў (а іх у распараджэнні было некалькі) была надрукавана ў якасці фотаілюстрацыі да артыкула, за цытату з якога «Нашай Ніве» было вынесена папярэджанне.

Гэтае данясенне было складзена 26 кастрычніка, а выслана, у тым ліку на адрас галоўнай санітарнай доктаркі Качан В.В., 28.10. А яшчэ 2.11 Качан В.В. праз дзяржаўныя СМІ паведамляла, што ў Беларусі няма эпідэміі грыпу A/H1N1 і нічога не паведамляла пра выпадкі смерці ў выніку яго. Між тым, па нашай інфармацыі, пік ускладненняў прыпаў на канец кастрычніка і першыя дні лістапада.

У сувязі з вышэйпазначаным журналісты газеты прыйшлі да высновы, што органы Міністэрства аховы здароўя не давалі праўдзівай і даставернай інфармацыі. Мы вымушаны былі грунтавацца на інфармацыі, атрыманай з крыніц сярод медыцынскіх работнікаў краіны.

«Наша Ніва» апублікавала ўзважаны артыкул на гэтую тэму. У ім, у прыватнасці, гаварылася: «Пакуль зарана казаць, ці беларускія дактары маюць справу толькі са свіным грыпам, ці таксама з іншым варыянтам віруснай інфекцыі. Характэрна толькі тое, што сёлетняя інфекцыя распаўсюдзілася надзвычайна рана як для грыпу і, у невялікай колькасці выпадкаў, дае сур'ёзныя ўскладненні ў выглядзе хуткацечных пнеўманій».

Вядома, органы аховы здароўя могуць прызнаваць вірусныя інфекцыі і выкліканыя імі пнеўманіі прычынай смерці — як гэта робіцца ва Украіне, Расіі і Польшчы, а могуць не прызнаваць. Урэшце, кожны чалавек памірае ад спынення сэрца. Вось і ў гэтым нумары газеты мы прыводзім гісторыю Сяргея Коршака, які памёр у выніку грыпу, ускладненага пнеўманіяй. А афіцыйная прычына смерці гучала: сардэчна-лёгачная недастатковасць (старонкі 1, 5).

Супрацьпраўна хаваць ад грамадства жыццёва важныя для яго звесткі, асабліва такія, што тычацца пашырэння вірусных інфекцый. У адпаведнасці з арт. 14 Закона РБ «Аб дзяржаўных сакрэтах» не можа быць сакрэтнай інфармацыя, важная для захавання здароўя грамадзян і датычная эпідэміялагічных сітуацый. Больш за тое, хаваць рэальны стан спраў — кашчунна ў адносінах да памерлых.

Мы маем права шукаць інфармацыю не толькі ў афіцыйных, але і ў неафіцыйных крыніцах. Мы маем права на правядзенне журналісцкіх расследаванняў.

Мы настойваем і абсалютна ўпэўненыя, што інфармацыя, апублікаваная ў «НН», праўдзівая, а вось звесткі, якія афіцыйна прыводзілі органы аховы здароўя, — няпоўныя.

Упэўніваем Вас, што журналіст прыняў усе магчымыя меры, каб праверыць атрыманую інфармацыю. Тое, што яна адпавядае рэчаіснасці, пацвярджаецца:

1. дакументам, які надрукаваны ў якасці фотаілюстрацыі да артыкула;
2. звесткамі ад супрацоўнікаў медычных установаў, імёны якіх мы не маем права называць згодна з артыкулам 39 закона РБ «Аб сродках масавай інфармацыі», а таксама надрукаваных у шэрагу сродкаў масавай інфармацыі;
3. сярэднімі дадзенымі аб смяротнасці ў Беларусі, у тым ліку і тымі, якія надалей выказваліся афіцыйнымі асобамі (звяртаем Вашу ўвагу, што лічбавыя дадзеныя, якія прыведзеныя ў артыкуле: «па стане на пятніцу, 30 кастрычніка, у краіне зафіксавана 39 смерцяў, з іх 9 у Мінску», — тычацца кастрычніка, а не аднаго дня).

Мы звярнуліся да Міністэрства аховы здароўя і Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама з лістом наступнага зместу:

**«Міністэрству аховы здароўя Рэспублікі Беларусь**

**Намесніцы міністра аховы здароўя, галоўнаму санітарнаму доктару Рэспублікі Беларусь Качан В.І.**

**Камітэту па ахове здароўя Мінгарвыканкама**

**газеты «Наша Ніва»**

**ЗАПЫТ**

У адпаведнасці з арт. 34 Закона РБ «Аб сродках масавай інфармацыі» і арт. 14 Закона РБ «Аб дзяржаўных сакрэтах»

просім

1. Прадаставіць інфармацыю аб агульнай колькасці памерлых ад пнеўманіі ў Беларусі ў цэлым і ў Мінску на працягу кастрычніка 2009 года.

2. Прадаставіць магчымасць азнаёміцца з унутранай перапіскай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама на тэму развіцця эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне і горадзе Мінску за перыяд з 20.10 да 10.11.2009».

Пасля атрымання адказу на наш зварот да Міністэрства аховы здароўя і Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама мы яшчэ раз вернемся да абмеркавання сітуацыі, звязанай з надрукаваннем артыкула, які стаў нагодай вынясення папярэджання.

На жаль, на момант напісання дадзенага ліста мы не маем адказаў з вышэйпазначаных інстанцый.

У канцы кастрычніка — пачатку лістапада склалася незвычайная сітуацыя. Мінск літаральна кіпеў ад чутак, звязаных з хваляй грыпу. А афіцыйныя кіраўнікі органаў аховы здароўя адмаўлялі наяўнасць любых праблем. Наша ўвага да гэтай тэмы была абгрунтаваная абаронай праваў нашых чытачоў. Калі б не розгалас вакол праблемы, узняты СМІ, сумнеўна, што грамадства і сёння мела б афіцыйныя звесткі па статыстыцы захворванняў.

Запэўніваем, што «Наша Ніва» будзе публікаваць выключна даставерную інфармацыю.

Рэд.



**Міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч і ягоная намесніца Лілія Ананіч.**

# Мядзведзеў — Лукашэнку: Не адграбай

Рэпартаж рэдактара «Нашай Нівы» **Андрэя Скурко** з Барвіхі.


ПРЭС-СЛУЖБА ПРЭЗІДЭНТА РАСІІ

Беларускіх журналістаў прэзідэнт Расіі прымаў у сваёй рэзідэнцыі ў пасёлку Барвіха. Шлях туды з Масквы ляжыць праз вёску Раздоры і займае 20—25 хвілінаў язды, пры ўмове адсутнасці затораў на маскоўскіх вуліцах.

Катэджны пасёлак Барвіха населены, як бачна, людзьмі з рознымі маёмаснымі магчымасцямі. Ёсць катэджы кшталту як у беларускіх «царскіх сёлах». Ёсць палацы, схаваныя за платамі, што мала саступаюць крамлёўскай сцяне. У пасёлку вядзецца актыўнае будаўніцтва. Мікрааўтобусам, у якіх беларускіх журналістаў вязуць на сустрэчу з прэзідэнтам Расіі, запраста перагароджвае дарогу самазвал, гружаны бетоннымі плітамі. Ён не можа ўпісацца ў вароты аднаго з катэджаў. Крамлёўскія кіроўцы рэагуюць спакойна. Звычайная, відаць, тут справа.

### Прасцей, чым у Драздах

Не сказаць, што рэзідэнцыя Мядзведзева месціцца наводшыбе, схаваная ад людскіх вачэй. Проста ўздоўж яе агароджы шуміць дарога, пралятаюць пыльныя грузавікі і іншыя транспартныя сродкі насельнікаў Барвіхі. Сама агароджа, дарэчы, прайграе многім бачаным тут. Усяго якіх метры два ў вышыню. Цагляны мур са слупамі і ажурнымі кратамі наверсе. На прахадной — густоўныя каваныя вароты з ліхтарамі. Асфальт на падыходах не ідэальны, трапляюцца лужыны, у адной з іх плавае недакурак. Мікробус тармозіць: праверка дакументаў. Яе ажыццяўляе карэктны спецслужбіст сярэдніх гадоў. Скуранка, касцюм, дарагі гальштук. Незапамінальны твар пуцінскага тыпу. Масіўны працыўдарны гадзіннік на запясці. «Чаму ў спісе прозвішча праз «о», а ў пашпарце — праз «а»?» Уладальнік пашпарта тлумачыць, што так пішацца па-беларуску.

Праверка і чаканне ля варот трывае паўгадзіны. Уязджаем. Злева застаецца будынак гаспадарчых службаў з пажарнай, міліцэйскай, іншымі машынамі, справа — лістападаўскі парк: прэлая лістота, сляды ад трактарных пратэктараў на раскіслай зямлі.

У глыбіні хаваецца палацык рэзідэнцыі. Афіцыйна ён завецца замак Меендорф. Выглядае адпаведна, па-нямецку. Кшталту паляўнічага замка нямецкага князя XIX стагоддзя. Праўда, ад сапраўднага замка тут мала засталося: ён амаль з нуля быў адноўлены, калі трапіў ва ўласнасць Адміністрацыі прэзідэнта Расіі. За саветамі тут быў клуб адпачынку саўгаса «Барвіха». Адміністрацыя, выкупіўшы, спачатку выкарыстоўвала яго як даходны дом — здавала ў арэнду пад багатыя вяселлі «ў сапраўдным замку». Пасля было вырашана выкарыстоўваць Меендорф для прыёму замежных дэлегацый. Тут бываў Лукашэнка, вяліся, як пасля адзначыць Мядзведзеў, «няпростыя перамовы» падчас расійска-грузінскага канфлікту.

Асабісты надгляд на ўваходзе мінімальны, дакладней, яго няма. Адзінае — журналісты з усімі рэчамі праходзяць праз усталяваную ў калідоры рамку, якая ніяк не рэагуе на наяўнасць дробных металічных прадметаў у кішэнях. Люстэркі, гардэроб у калідоры, зала з вялікім экранам. Адсюль прэсканферэнцыю змогуць глядзець прадстаўнікі расійскіх СМІ. Непасрэдна з Мядзведзевым будуць гутарыць толькі 14 беларускіх журналістаў: сем з незалежных, сем з дзяржаўных выданняў. Тут жа — стол з перакусам: сэндвічы, пірожныя. Як бачна на экране, настройка апаратуры ў самым разгары. Тэхнікі правяраюць мікрафоны ў памяшканні для прэс-канферэнцый.

### Вядома ж, Мытны саюз

Журналісты дзяржаўныя і недзяржаўныя тым часам карыстаюцца адсутнасцю ідэалагічных барыкад. Высвятляецца, што многія разам працавалі, маюць масу знаёмых. Яшчэ цясней яднае ўсіх няведанне — навошта нас сюды пазвалі? Што будуць казаць?

З'яўляецца прадстаўнік прэсслужбы прэзідэнта Расіі. Ад яго ўпершыню дазнаёмся, што прэс-канферэнцыя прысвечаная 10-годдзю ўтварэння саюзнай дзяржавы. Праслізгваюць словы «фармальна прысвечаная». Бо саюзную дамову падпісвалі 8 снежня 1999 года. «Але вырашылі раней адзначыць», — удакладняе работнік прэс-службы. Падаюцца нашмат важнейшымі іншыя нагоды — хуткі візіт Дзмітрыя Мядзведзева ў Мінск на міждзяржаўны саміт і, «вядома ж», пытанне Мытнага саюза.

Ахвотным прапануюць загрыміравацца перад тэлетрансляцыяй у асабістага грымёра прэзідэнта Расіі.

Дазнаёмся, што ў рэзідэнцыі ёсць бяздротавы інтэрнэт. Выпрошваем пароль: «Не бойцеся, мы пасля не будзем хадзіць сюды карыстацца нэтам».

### Тыт.ру

Браць ноўтбукі на сустрэчу забараняюць. Як і мабільныя тэлефоны, як і «ўсё лішняе з кішэняў». Чарнявы камлюкаваты ахоўнік — адзіны, які будзе прысутнічаць на прэс-канферэнцыі, — крывіцца нават на дыктафоны, аднак з імі прапускае. Ізноў праходзім пад рамкай. Ахова паводзіцца карэктна. Нават з элементамі душэўнасці. «Хто хоча пакурыць, рабіце гэта зараз. Там магчымасці не будзе», — жартуе ахоўнік.

Сцены залы для сустрэч абшытыя разьблёнымі панэлямі з цёмнага дрэва. На сценах — невялікія гравюры і малюнкі. Сюжэты ў асноўным ваенныя: узброеныя рыцары, ваяры розных часоў. Вялікая карціна са сцэнай палявання на тарцовай сцяне. Рассаджваемся за вялікім сталом у адпаведнасці з расстаўленымі на ім таблічкамі з прозвішчамі. Насупраць рэдактаркі партала tut.by Марыны Золатавай шыльда ў перакладзе на расійскую: tyt.ru.

Выяўляецца, што нашыя «сем пар чыстых, сем пар нячыстых» рассадзілі роўна праз аднаго па прынцыпе дзяржаўны—недзяржаўны. Пакуль чакаем Мядзведзева, абносяць чаем.

Звяртае ўвагу адсутнасць на сустрэчы прадстаўніка мінскай «Белгазеты». Мо крамлёўская прэс-служба палічыла ані дзяржаўным, ані незалежным выданнем?

### Шэпт прэзідэнта

Прэзідэнт Расіі з'яўляецца са спазненнем хвілінаў на дваццаць. Згодна з этыкетам, устаём. Дзмітрый Мядзведзеў амаль шэптам просіць усіх сесці. «Мы мала кантактуем, — пачынае ён. — Часта інфармацыя пра нашы дзеянні трапляе ў прэсу з ускосных крыніц». Далей, матывуючы гэту сустрэчу з беларусамі, прэзідэнт Расіі не без іроніі спасылаецца на досвед Аляксандра Лукашэнкі, які «паказаў прыклад», — сустракаецца з расійскімі журналістамі «шчыра, паспяхова і рэгулярна».

Шпілек і апеляцый да беларускага кіраўніцтва падчас прэс-канферэнцыі хапала. Так, заявы Лукашэнкі пра нявыгаду Мытнага саюза для Беларусі Мядзведзеў назваў «кан'юнктурнымі выступленнямі», а размовы пра непрызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, на думку расійскага прэзідэнта, «нагадваюць гандаль з нагоды таго, хто болей зробіць добрага, вось за тых мы і будзем».

### Хто супраць Пуціна — той супраць мяне

Жалеза ў голасе кіраўніка Расіі бразнула толькі раз: калі каментаваў «спецыфічныя выказванні» на адрас Пуціна, якія дапускае кіраўніцтва Беларусі. (Прагучалі яны якраз падчас сустрэчы Лукашэнкі з расійскімі журналістамі.) «Гэты ўрад прызначаўся Дзяржаўнай Думай па маім прадстаўленні. І калі той ці іншы мой калега палемізуе з гэтым урадам — ён палемізуе са мной». Гэтым прэзідэнт Расіі нібы абверг магчымасць «убіць клін» між ім і Пуціным, верагоднасць чаго выказвалася ў некаторых публікацыях.

Пуціна кіраўнік Расіі паслядоўна называў «мой папярэднік». Двоеўладдзе ў сённяшняй Расіі чыталася ў фарму-

**Адказ Мядзведзеву: Лукашэнка сустрэнецца з кіраўнікамі дзяржагенцтваў СНД**

У раду кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў СНД уваходзяць кіраўнікі ІТАР–ТАСС, БелТА, Укрінфарм, АзерТАдж, Арменпрэс, Казінфарм, Хавар.

лёўках Мядзведзева пра тое, што «я асабіста не звяртаўся» (каб Беларусь прызнала Абхазію і Паўднёвую Асецію), «у маю бытнасць прэзідэнтам такіх зваротаў да мяне не было» (аб помачы Расіі ў расследаванні шэрагу гучных злачынстваў, у тым ліку выкрадання журналіста Змітра Завадскага). Хоць, адказваючы на апошняе пытанне, Мядзведзеў падкрэсліў, што ўсе злачынствы «павінны быць расследаваны, пакуль не знойдзены вінаватыя», — і гэта датычыць як Беларусі, так і Расіі.

## Выкрэсліваў па меры агучвання

Увесь час падкрэслівалася «асаблівае стаўленне», якое мае Расія да Беларусі. Нагадвалася, што «Беларусь — найбуйнейшы пазычальнік нашых сродкаў»: Расія пазычыла Беларусі столькі, колькі МВФ яшчэ толькі збіраецца — 3 млрд даляраў. Што газ Беларусь заўжды атрымлівала па льготных цэнах. Што агульны аб'ём прэферэнцый для Беларусі складае $50 млрд (Мядзведзеў параўнаў з прэферэнцыямі Украіне — $75—100 млрд). Што Беларусь мае найбольшыя аб'ёмы экспарту ў Расію — 99,9% мяса, да 95% цукру, 82% малочных прадуктаў. А летась малака было яшчэ болей, акцэнтаваў Мядзведзеў.

У нататніку расійскага прэзідэнта ляжала памятка, азагалоўленая «Лічбы і даты» — з раздрукаванымі статыстычнымі звесткамі, што тычыліся аб'ёму беларускага экспарту ў Расію, велічыні беларускіх пазык Расіі. Па меры агучвання Мядзведзеў выкрэсліваў з памяткі пазіцыі.

## «Пажывём — убачым»

Уколы чаргаваліся з пернікамі: было адзначана, што цана на газ для Беларусі ў 2010 г. будзе на 30—40% меншая за цану паставак у «супастаўныя [па даўжыні транспартнага пляча] дзяржавы». У чацвёртым квартале 2009 года яна складае 122 даляры за тысячу кубоў. Цана на наступны год будзе разлічвацца аўтаматычна, на грунце дзейнага кантракта, зацеміў прэзідэнт Расіі. Як вядома, Беларусь прасіла «Газпром» ад кантракта адступіць.

У падсумаванне газавай тэмы, адказваючы на пытанне прадстаўніка дзяржаўнага інфармагенцтва БЕЛТА, чаму Расія адмаўляецца ад «найкарацейшага шляху ў Еўропу» праз Беларусь і вядзе газаправод па дне Балтыйскага мора, Мядзведзеў адказаў, што «транзіт праз дзяржаву не заўсёды стабільны». Перспектывы ж будаўніцтва праз Беларусь газаправода Ямал-Еўропа-2 расійскі прэзідэнт акрэсліў ёмкім расійскім «пажывём — увідім». Іх разглядзяць, толькі калі будуць запатрабаваныя адпаведныя аб'ёмы газу. Праект будаўніцтва газапровода «Паўночны паток» па дне Балтыкі, безумоўна, даражэйшы, але «гарантуе выкананне абавязацельстваў па пастаўках», адзначыў Мядзведзеў, намякнуўшы на былыя «газавыя войны».

**Яны ж рускіх на дух не пераносяць**

**Аляксандр Лукашэнка заявіў, што «прэзідэнт Расіі запрасіў такіх журналістаў, многія з якіх рускага чалавека на дух не пераносяць. Хоць бы параіліся, перш чым запрашаць».**

## Дзяржаўныя СМІ вострa наскоквалі

Увогуле, у вастрыні і праблемнасці пытанняў дзяржаўныя СМІ не саступалі незалежным. А месцамі нават перайгравалі. Прадстаўнік Першага нацыянальнага канала спытаўся пра будучыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі. Ці мае Расія свой сцэнар? І ці думае Мядзведзеў, следам за незалежнай прэсай, запрасіць да сябе беларускіх апазіцыйных палітыкаў? А перш, чым задаць пытанне, журналіст БТ падкрэсліў, што «наша краіна называецца Беларусь — менавіта так, восем літар, мяккі знак на канцы» і параіў ужываць менавіта гэты варыянт, а не «Белоруссия». З чым Мядзведзеў, безумоўна, пагадзіўся.

Умешваецца ж ва ўнутраныя справы Беларусі, адзначыў Дзмітрый Мядзведзеў, у Расіі «і ў думках не было». Хай беларускі выбаршчык сам «вызначае, хто яму мілы». Адначасова ён падкрэсліў, што Расія «самым дэталёвым чынам» сочыць за развіццём палітычных працэсаў у краіне, «з якой мы звязаны саюзным дагаворам».

У адказ на пытанне пра сустрэчу з беларускай апазіцыяй, Мядзведзеў не выключыў такой магчымасці. «Калі да нас прыязджаюць замежныя лідэры, яны сустракаюцца з нашай апазіцыяй — падабаецца нам гэта ці не», — сказаў расійскі прэзідэнт.

## «Шасцю абласцямі»? Ды што вы…

Цягам гутаркі Мядзведзеў усюды, дзе мог, падкрэсліваў незалежнасць Беларусі. Адказваючы на пытанне-заклік прадстаўніка «Звязды» паставіць кропку ў спрэчках вакол даўняй прапановы Пуціна, каб Беларусь увайшла ў РФ шасцю абласцямі, прэзідэнт адзначыў, што «Расія ні дэ-факта, ні дэюрэ не прапаноўвала Беларусі ўступіць у склад Расійскай Федэрацыі». А Пуцін, маўляў, усяго хацеў сказаць, што па ўнутрырасійскай цане газ пастаўляецца толькі суб'ектам федэрацыі.

Дэкларaванне незалежнасці Беларусі часта перарастала ў сцвярджанне кшталту «хазяін-барын». Не хоча Беларусь уступаць у Мытны саюз? Ніхто і не цягне сілком! Не хоча прызнаваць Паўднёвую Асецію? А мы ніколі і не прасілі пра гэта! Беларусь удзельнічае ў праграме «Усходняе партнёрства»? На здароўе, калі лічыце гэта выгадным. А лейтматывам агучваліся лічбы заёмаў, паставак і прэферэнцый.

## Няма вечных пошлін

Той жа Мытны саюз. Вядома, нявыгадна для Беларусі падымаць да расійскага ўзроўню мыты на ўвоз патрыманых аўто з Захаду. І Мядзведзеў даў зразумець, што Расія тут не адступіцца. З іншага боку, адзначыў, што Расія гатовая да павелічэння шэрагу плацяжоў, пошлін па буйных машынах — па МАЗах, у прыватнасці па аўтамабілях адпаведнай катэгорыі. Саюз выйдзе цяжкім для беларускіх грамадзян, але выгадным для беларускай прамысловасці. Думайце, Аляксандр Рыгоравіч.

Мядзведзеў таксама адзначыў, што «няма нічога вечнага — няма вечных пошлін, але зараз, на цяперашнім этапе, для гарманізацыі нашых фінансавых адносін, мытных адносін на гэта неабходна пайсці».

## Напад на ўвесь блок

Яшчэ адно пытанне, што тычылася незалежнасці — Дамова пра калектыўную бяспеку і выкарыстанне беларускіх войскаў у ваенных аперацыях у рамках КСАР. У адказ журналісту Мядзведзеў, «як юрыст юрысту», паведаміў, што гэта рэгламентуецца беларускай Канстытуцыяй, з аднаго боку. А з іншага — міжнародным правам, якое мае наднацыянальны характар і «па ідэі, павінна мець перавагу сілу ў параўнанні з унутраным заканадаўствам». Да ліку наднацыянальных дакументаў адносіцца і Дамова пра Калектыўныя сілы бяспекі. А напад на адну з краін расцэньваецца як напад на ўвесь блок. «Гэта і ёсць партнёрства», — адзначыў Мядзведзеў.

## Палкі-ёлкі

Мядзведзеў прызнаў, што ў двухбаковых адносінах «ёсць унутраныя спрэчкі, але гэта ўсё роўна іншы ўзровень інтэграцыі». «Навошта ж нам адграбаць ад узроўню інтэграцыі?» — рытарычна запытваўся ён.

Слова «адграбаць» у значэнні «разрываць інтэграцыйныя сувязі з Расіяй» Мядзведзеў ужыў двойчы цягам гутаркі. Дзесьці ў лексіцы расійскага прэзідэнта мільганулі і «палкі-ёлкі», таксама не выдаленыя з тэксту канчатковай стэнаграмы, да гонару крамлёўскай прэс-службы.

Дый уся гэта прэс-канферэнцыя была адным вялікім знакам Лукашэнку, які спрабуе «адгрэбсці» не ў патрэбны Расіі бок.



ПРЭС-СЛУЖБА ПРЭЗІДЭНТА РАСІІ

**Заявы Лукашэнкі «насілі надта спецыфічны характар»**

«За апошні час з боку беларускіх калег, ад прэзідэнта Беларусі было зроблена шмат эмацыйных заяваў, якія часта выходзілі за межы дыпламатычнага пратакола, а калі казаць гранічна шчыра — насілі надта спецыфічны характар у дачыненні да нашых службовых асобаў», — і Мядзведзеў удакладніў: — Я маю на ўвазе членаў урада і старшыню ўрада Расіі». Ён падкрэсліў: «Мне гэта не падабаецца. Я лічу — гэта недапушчальна». Мядзведзеў падкрэсліў, што ўрад прадстаўляў на зацвярджэнне ён, таму любая палеміка з членамі ўрада — гэта і палеміка з ім.

**Расія тры мільярды дала, а МВФ толькі набліжаецца**

Паводле слоў Мядзведзева, у Расіі «няма ні з кім такіх адмысловых фінансавых адносін, як з Беларуссю». «Беларусь — найбуйнейшы пазычальнік расійскіх сродкаў», — сказаў Мядзведзеў і падкрэсліў, што за апошнія два з паловай гады Беларусь атрымала ад Расіі больш як тры мільярды долараў фінансавай дапамогі. Гэта, падкрэсліў прэзідэнт, і ёсць прыклад рэальнага напаўнення саюзніцкіх адносін. Мядзведзеў адзначыў, што агульная падтрымка Беларусі з боку МВФ і еўрапейскіх інстытутаў «толькі набліжаецца да лічбы тры мільярды долараў».

**Пра ўваход «шасцю абласцямі»: нас не зразумелі**

«Расія ні дэ–факта, ні дэ–юрэ не прапаноўвала Беларусі ўступіць у склад Расійскай Федэрацыі», — заявіў Мядзведзеў. А рэпліка Уладзіміра Пуціна ў палеміцы вакол цэнаў на газ, маўляў, значыла, што па ўнутрырасійскай цане газ пастаўляецца толькі суб'ектам федэрацыі.

**Мядзведзеў стараўся легкаважыць «Усходняе партнёрства»**

«Я — памяркоўны [здравомыслящий] чалавек. Як я магу заклікаць не ўдзельнічаць у тым ці іншым аб'яднанні, калі самі дзяржавы лічаць для сябе тое выгадным?» — сказаў Мядзведзеў. «Не бачу нічога звышнатуральнага ў гэтым «Усходнім партнёрстве». Але я, шчыра кажучы, і карысці асаблівай ад яго не бачу. І гэта мне пацвярджаюць усе ўдзельнікі гэтага «Партнёрства», з кім я размаўляў. Але я не бачу нічога, скіраванага непасрэдна супраць нашай краіны», — падкрэсліў Мядзведзеў.

**Мыты на аўтамабілі: «трэба перажыць»**

Мядзведзеў адназначна заявіў, што пошліны на аўто будуць падымацца, у выпадку падпісання дамовы па Мытным саюзе: «Ужо калі мы дамаўляемся, а гэта ў цэлым для нас выгадна, то мы, безумоўна, павінны ўніфікаваць і пошліны, прычым пайсці на ўзаемныя дзеянні». Пры гэтым Мядзведзеў адзначыў: «З аднаго боку, паніжаюцца пошліны на іншамаркі ў Беларусь, з іншага боку, мы гатовыя да павелічэння шэрагу плацяжоў, пошлін па буйных машынах — па МАЗах, у прыватнасці па аўтамабілях адпаведнай катэгорыі».

Гэта балюча, прызнаў ён, але «нам трэба гэты перыяд перажыць». «У канчатковым выніку, ужо стварыўшы Мытны саюз, мы можам у пэўны момант дамовіцца аб новых адзіных правілах гульні», — сказаў ён.

**Сітуацыя ў эканоміцы Расіі горшая, чым у Беларусі**

«Беларусь па выніках года можа паказаць невялікі рост, а ў Расіі будзе падзенне», — прызнаў Дзмітрый Мядзведзеў. Прычыны гэтага, адзначыў ён, у збыткавай экспартна–сыравіннай скіраванасці расійскай эканомікі, правалах Расіі ў галінах металургіі і машынабудавання сёлета. Поспех Беларусі, сказаў расійскі прэзідэнт, абумоўлены тым, што яе эканоміка «аказалася больш абароненай», а таксама «своечасовымі рашэннямі» беларускага кіраўніцтва і, не ў апошнюю чаргу, дапамогай Расіі. «Калі б нам нехта аказаў такую помач, сувымерна з маштабамі нашай эканомікі, лічба нашага падзення магчыма была б трохі меншай», — адзначыў расійскі прэзідэнт.

**Беларусь не звярталася па дапамогу ў расследаванні выкрадання Завадскага**

«Я не ведаю, якія звароты былі да таго, але ў маю бытнасць прэзідэнтам такіх зваротаў да мяне не было», — сказаў Мядзведзеў, адказваючы на пытанне, ці Беларусь не звярталася да Расіі па дапамогу ў расследаванні шэрагу гучных злачынстваў, у тым ліку выкрадання тэлеаператара канала ОРТ Дзмітрыя Завадскага ў 2000 годзе.

Пры гэтым Мядзведзеў падкрэсліў, што ўсе злачынствы, учыненыя на тэрыторыі Беларусі, як і на тэрыторыі Расіі, «павінны быць расследаваны, пакуль у іх не будзе пастаўлена кропка, не знойдзены вінаватыя, не ўстаноўлена, што адбылося».

**Беларусь атрымала ад Расіі прэферэнцый на $50 млрд**

Цана на газ у 2010 годзе будзе на 30—40% меншая за цану паставак у «супастаўныя [па даўжыні транспартнага пляча] дзяржавы». Цана на наступны год будзе разлічвацца аўтаматычна, на грунце дзейнага кантракта. У чацвёртым квартале 2009 года цана складае 122 даляры за тысячу кубоў. Мядзведзеў асабліва падкрэсліў, што Беларусь заўжды атрымлівала газ па льготных цэнах. Ён спаслаўся на падлікі экспертаў, згодна з якімі ад моманту здабыцця Беларуссю незалежнасці аб'ём расійскіх прэферэнцый для Беларусі ў выглядзе льготных цэнаў на сыравінныя рэсурсы склаў $50 млрд. (Мядзведзеў параўнаў з прэферэнцыямі Украіне, якая атрымала $75—100 млрд).

Адначасова ён заўважыў, што Расія нават унутры краіны рухаецца да цэнаў на газ, набліжаных да сусветных.

# Цуд з рухавічком

Дзяўчыне з Бабруйска, якая не можа хадзіць, моладзь сабрала грошы на электрычны вазок.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

Шэсць прыступак — многа гэта ці мала? Большасці з нас, каб пераадолець іх, спатрэбіцца зрабіць тры крокі. Старому чалавеку — шэсць крокаў, з перапынначкам на адпачынак. А спрытнаму хлапчуку ці дзяўчынцы — усяго адзін скок.

### Шэсць прыступак — як Альпы

Звычайны жылы дом у Бабруйску. Кватэра на першым паверсе. Ад яе дзвярэй да вулічнага асфальту — шэсць прыступак. Але для Інгі Татур, якая жыве за гэтымі дзвярыма, тыя прыступкі, што Альпы — непераадольныя. Інга Татур не мае магчымасці рухацца, бо пакутуе на міяпатыю — хваробу, пры якой пакрысе адмаўляюцца працаваць цягліцы. Зрэшты, слова «пакутуе» зусім не пасуе для гэтай жанчыны, якая літаральна свеціцца спакоем.

Бацька Інгі выносіць на лесвічную пляцоўку дзве доўгія дошкі і кладзе іх на прыступкі. У гэты час маці Інгі моцна абдымае дачку і (адкуль столькі сілаў у немаладой худзенькай жанчыны?) перасаджвае яе з канапы ў старэнькі інвалідны вазок. Пасля манеўраў у калідоры вазок падкатваюць да дошак спінкай наперад (каб Інга не выпала з яго на схіле). Пачынаецца цяжкі спуск. Бацька з усяе моцы ўпіраецца ў вазок, стрымліваючы яго. Сантыметр за сантыметрам, прыступка за прыступкай, Інга спускаецца ўніз. Нарэшце — выхад на вуліцу. Уздыхнуўшы з палёгкай, Інга паглядае ў неба. Першы раз за колькі месяцаў яна выйшла на шпацыр.

**Міяпатыя**

хвароба, пры якой пакрысе адмаўляюцца працаваць мускулы. Яна прагрэсуе цягам жыцця. Хвароба спадчынная, звязаная з парушэннем абмену рэчываў у мускульнай тканцы. Лячэнню не паддаецца. Працякае паволі. З вядомых людзей Беларусі на такую сама хваробу пакутавала паэтка Ніна Мацяш.

### Самастойнасць за тры тысячы еўра

«Вось цяпер я з вамі паеду гуляць, гэта мая вельмі даўняя мара, — цешыцца Інга, пакуль вазок падскоквае на шчарбатым асфальце. — Учора сяброўцы патэлефанавала: «Ты ведаеш, прыедуць з Мінска, мяне гуляць будуць!».

Маці і бацьку Інгі ўжо не стае сілаў, каб часта выводзіць дачку на вуліцу. А яе брат і сястра маюць свае сем'і і не заўжды могуць знайсці час на шпацыр. Але найбольш Інгу засмучае адсутнасць самастойнасці. Нават на вуліцы сілы яе рук не хапае для таго, каб круціць колы старога інваліднага вазка. А набыць сучасны вазок з электрычным рухавіком няма магчымасці — каштуюць яны, як той аўтамабіль (каля трох тысячаў еўра). Інга была б рада сама зарабіць на такі апарат, ды дзе там: працы для інвалідаў вобмаль. Бацькі ж яе — сумленныя небагатыя людзі. Тата — былы кіроўца-дальнабойшчык, дайшоў у свой час ажно да Партугаліі. «Даехаў бы, можа, і далей, але там ужо акіян», — жартуе ён.

У замежжы ён нагледзеўся, як еўрапейскія дзяржавы клапоцяцца пра інвалідаў, і таму на беларускія парадкі крыўдуе. Маці Інгі вырасла на Сахаліне. «Калі прыехала сюды, то думала, што ўсе людзі спяваюць», — кажа яна пра беларускае вымаўленне. Людзі яны ўжо немаладыя, пенсіі ў іх звычайныя, і ашчадзіць грошай на электрычны вазок ім не здужаць.

А пасоўваць вазок з Інгай сапраўды нялёгкая справа. З нязвычкі пад канец трохгадзіннага шпацыру на руках нават з'яўляюцца мазалі. Любая перашкода на шляху — бардзюр, парапет, прыступка, шчарбаты асфальт, карані на глебе — ператвараецца ў непераадольную.

### Лабірынт для інвалідаў

Калі здаровы чалавек можа перасоўвацца па горадзе па простых маршрутах, дык інваліды блукаюць па вуліцах, нібыта па лабірынце, бо ім даводзіцца шукаць пляскатыя паверхні. Пашпацыраваўшы так, разумееш, што многія пандусы (заезды для вазкоў) непрыдатныя для выкарыстання — бо занадта стромыя. Нават здароваму чалавеку, які суправаджае інваліда, цяжка падняць вазок на такі пандус — не кажучы ўжо пра тое, каб сам чалавек у вазку здолеў зацягнуць сябе ўгару.

Магчыма, рукі ў Інгі не надта дужыя, а вось моцы яе духу можна толькі пазайздросціць. Яна не толькі не дае сабе сумаваць, але і клапоціцца пра іншых. Яе старэйшыя пляменніцы — Альбіна і Насця — у сваю цётку проста закаханыя. Яна і гуляецца з імі, і ўрокі робіць, і чытае, і мовы вучыць, і па інтэрнэце блукае. Таксама Інга ўсяляк прывівае дзяўчатам любоў да роднай культуры. А яшчэ Альбіна і Насця — частыя гераіні дописаў Інгі ў яе інтэрнэт-дзённіку.

**Мы часта выгляд сабе малюем, антураж робім, а ўнутры гармоніі няма. А ў душы Інгі гэтая гармонія ёсць.**

Год таму, на Раство, Інга вярталася з каляднай службы ў царкве. Сусед узяўся дапамагчы бацьку ўзняць вазок па прыступках да кватэры. «Падняць трэба ўсяго на шэсць прыступак, для двух мужчынаў гэта не такая ўжо цяжкая праца, — апісала здарэнне Інга ў сваім інтэрнэт-дзённіку. — Адзін трымае вазок за ручкі, а другі за падножкі і... панеслі «бярвенца». Галоўнае, каб той, хто трымае за падножкі, не апускаў іх занадта нізка, бо тады я саслізгваю ўніз і, у горшым выпадку, выпадаю з вазка. Сусед трымаў нізка, вельмі нізка, і я паехала ўніз. Воячкі, які жах! Пра сябе малілася: «Божа, Божа, злітуйся, дапамажы!» А ўслых раіла (гучна): «Дзядзечку, уздымайце вышэй!» Дзядзечка так і не ўзняў іх, і, каб нeяк запа-

## ПОШТА РЭДАКЦЫІ




### «Лінія Сталіна» ўжо і ў Маладзечне

**Па «службовых», як кажуць, справах наведаў Маладзечна.** Сярод іншага завітаў у прывакзальны ўніверсам «Чыгуначны». Ніякіх крытычных заўваг да гэтай крамы не меў і не маю сёння. Больш таго, можна гэты ўніверсам і пахваліць — уся візуальная інфармацыя па-беларуску. У нас, у Глыбокім, гадоў дзесяць, як паздымалі ўсе беларускія шыльды.

Чытаю адозву: «Купляйце беларускае!» Гляджу на паліцы. Розныя гатункі спіртных напояў… «Линия Сталина» — настойка горькая». Неверагодна!

Здзіўляе маніякальнае завіханне пэўнай часткі нашага народа, да якога і я належу, перад рознымі тыранамі і вар'ятамі. То Полацк Іван Жахлівы вызваліў… ад беларусаў, то Сувораву, нібы святому, царкву будуюць.

Прадаваць такі напой у гарадах Заходняй Беларусі — наогул кашчунства. Масавыя дэпартацыі ў Сібір тут адбываліся з 1939-га па 1953 год — да смерці Сталіна. Я ўжо не згадваю пра татальны выезд з калгаснага раю тысячаў і тысячаў беларусаў-каталікоў, цэлымі вёскамі, якія засялілі потым Гданьскае Памор'е. А маглі б працаваць у Беларусі і дзеля Беларусі...

За што мусяць быць удзячныя маладзечанцы Сталіну з Леніным? За тое, што гэты горад разам з Гроднам, Навагрудкам, Паставамі, Браславам — аддалі былі літоўцам? Зрэшты, каб не паход генерала Жалігоўскага на Вільню з маўклівай згоды Юзіка Пілсудскага, жылі б маладзечанцы даўно ў Еўрасаюзе і ў Вільню ездзілі б без візы!

Не лішне тут нагадаць, што ў 1944 годзе БССРаўскае кіраўніцтва прасіла Сталіна перадаць Беларусі горад Каралявец (Кёнігсберг), каб Беларусь мела выйсце да мора. Сталін не даў! Дый Беласточчыну перадаў палякам. Не кажучы пра ранейшыя страты Смаленшчыны і Паўночнага Падзвіння (Себеж, Вяліж).

Дык навошта нам тая «Лінія Сталіна»?

**Уладзімір Скрабатун, Глыбокае**

### Дарожнікі на Альгердавым шляху

**Шмат дзе яшчэ на Глыбоччыне захаваліся фрагменты даўняй брукаванай дарогі, што ішла з Вільні на Полацк.** Глыбоцкія краязнаўцы называюць яе Альгердавым шляхам: мяркуюць, што гэтай дарогай рухаліся войскі Вялікага Княства ў маскоўскіх паходах канца XIV стагоддзя.

Сёлета мясцовыя дарожнікі рэканструявалі ўчастак дарогі ад мястэчка Зябкі да Старых Зябак: пашырылі, выпрамілі павароты, паклалі асфальт. Падчас рамонтных работ былі спілаваныя ўсе старыя дрэвы, многім з якіх не менш як сто год.

Па дарозе, канечне, ездзіць стала лепш, але ўжо нічога не нагадвае пра старадаўні шлях. Ужо не адчуваецца дух даўняй эпохі. Ідучы па гладкім асфальце, цяжка ўявіць, як тут магла ступаць нага Альгерда або Сцяпана Батуры.

**Аляксей К., Полацк**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

воліць сваё слізгаценне, я легла яму на плячо. Дзякуй Богу, падняліся! Такі маленькі выпадак, а столькі адрэналіну ў крыві, эмоцыяў і перажыванняў, што праз яго на другі план адышлі ўсе іншыя падзеі дня. А прыехала ж з набажэнства, радаснага і святочнага...»

### Складанка на цуд

Адна з чытачак інтэрнэт-дзённіка Інгі, Наталка Васілевіч, была ўзрушаная гэтым допісам. «Чытаеш нататкі чалавека і думаеш, што ўсё пра яго ведаеш, — кажа яна. — А я і не ўяўляла сабе, што Інга не можа хадзіць».

Неўзабаве ў інтэрнэт-дзённіку Наталкі з'явіўся допіс, у якім яна прапанавала сваім сябрам і чытачам здзейсніць цуд на Каляды — сабраць грошы на электрычны вазок для Інгі. Задача гэтая была няпростая: сума немалая, дый знайсці вазок не так лёгка. Але крок за крокам справа пачала рухацца. З цягам часу ўтварылася цэлая сетка людзей, якія ашчаджалі свае грошы, час і сілы на тое, каб цуд здзейсніўся. Адны дапамагалі фінансава, іншыя сустракаліся, збіралі грошы, хтосьці распаўсюджваў інфармацыю пра акцыю. І вось, нарэшце, праз дзесяць месяцаў, сябры замовілі ў Польшчы электрычны вазок для Інгі.

У незвычайнай талацэ паўдзельнічала каля дваццаці пяці чалавек — самыя розныя людзі. Праваслаўная Наталка кінула сабраць вазок для Інгі, верніцы-пратэстанткі, а везлі яго ў Беларусь уніяцкія святары. Сярод тых, хто даваў грошы і дапамагаў шукаць вазок, былі і вернікі, і атэісты, і расійскамоўныя, і беларускамоўныя, і заўзятыя інтэрнэтчыкі і тыя, хто да кампутара падыходзіць гады ў рады. Лучыла людзей дабрыня і жаданне дапамагчы. 21 лістапада, лічы — перад самымі Калядамі, Інга ўжо выпрабоўвала ў Бабруйску свой новы электрычны вазок.

Удзельнікі талакі прэзентавалі Інзе не проста сродак перасоўвання — яны падаравалі ёй свабоду і самастойнасць. А ў адказ яны атрымалі не менш цудоўны падарунак — веру ў тое, што цуды на Каляды абавязкова здзяйсняюцца.

**Алесь Кудрыцкі**

Дзённік Інгі Татур можна прачытаць па адрасе http://michalinka.livejournal.com

# Інга Татур: «Калі я пачала верыць у Бога, то перастала баяцца»

Я ўсё дзяцінства чакала, калі пачну паміраць. А яшчэ я баялася надыходу моманту, калі я перастану хадзіць. Калі гэта здарылася, мне было 14 гадоў…

**«НН»: Распавядзіце, калі ласка, крыху пра сябе, пра сваю сям'ю.**

**Інга Татур:** Я нарадзілася ў Бабруйску ў 1969 г. Пражыла тут усё жыццё. Тата ў мяне тутэйшы, ён нарадзіўся ў Бабруйску ў 1944 годзе, калі горад яшчэ вызвалялі. У іх вялікая сям'я, шмат братоў, сёстраў.

А маці ў мяне з роду Крукоўскіх. Захаваўся адзін стары фотаздымак прадзеда Паўла Крукоўскага — там ён, малады, у мундзіры афіцэра царскай арміі. Потым ён служыў і ў Чырвонай. Пабраўся шлюбам з Марыяй Міхневіч, у іх нарадзілася пяцёра дзетак. Мая бабуля Ніна была старэйшай дачкой.

Жылі яны вельмі заможна, працавалі многа. Арыштавалі прадзеда разам з ягонымі братамі ў гады «яжоўшчыны» — а пасля расстралялі. Сям'ю выслалі ў Бабруйск, дзе вельмі хутка памерла мая прабабка Марыя. Дом і маёмасць разрабавалі. Бабуля Ніна тулялася з малодшымі братамі і сястрычкамі па здымных кутах, працавала нянькай. Пісала нават Калініну, каб ён дазволіў прыняць дзяцей «ворага народа» ў школу-інтэрнат. Дазволіў... А праз год пасля арышту Яжова майго прадзеда рэабілітавалі, пасмяротна.

**«НН»: Калі вы згубілі магчымасць хадзіць? Як вы перажывалі гэты момант?**

**ІТ:** Калі мне паўгода было, перахварэла нейкай хваробай. Дактары доўга не маглі разабрацца, чым я хварэю. Калі, нарэшце, даведаліся, у чым справа, мне ўжо было гадоў пяць. Я зразумела, пра што дактары размаўлялі з бацькамі. Яны казалі, што я хадзіць не буду, што хвароба будзе паступова развівацца, што я хутка памру. Я ўсё дзяцінства чакала, калі пачну паміраць. А яшчэ я баялася надыходу моманту, калі я перастану хадзіць. Калі гэта здарылася, мне было 14 гадоў.

Вельмі хутка, можа праз год, пачалі адмаўляць рукі. Уздымаю іх — а пальцы проста вісяць. А калі нейкія цягліцы перастаюць працаваць, то гэта, лічы, незваротна. Я спачатку вельмі перажывала, потым пачала маліцца. Я хаджу ў Евангельскую царкву, і там мы, калі молімся, рукі ўздымаем угару. Я кажу: «Вось бачыш, я нават не магу пальцамі паварушыць!» «А ты паспрабуй!» — нібыта чую ў адказ. Паспрабавала — пальцы трымаюцца трошкі — і падаюць. «А ты не засяроджвайся на іх! — у галаве такое. — Не засяроджвайся і ўсё, засяродзься на мне». Я пачала думаць пра Хрыста, маліцца. Малітву скончыла — і ўсё, працуе! На абедзвюх руках пальцы ажылі. Вось тады страх прайшоў. Ну, канечне, усё адно часам перажываеш, але гэта жыццё, і нават у такіх умовах трэба трымацца. Бо калі размазваешся — тады і размажашся. А калі трымаешся — дык і ўтрымаешся. Вось такія справы. Калі я пачала верыць у Бога, то перастала баяцца.

**«НН»: Бог, царква — што яны значаць для вас?**

**ІТ:** Як ужо сказала — можна размазацца, а можна трымацца. І тое, на чым ты трымаешся, — гэта Бог. Нядаўна так разважала: у Бібліі напісана, што словам Божым створаны нябёсы, сусвет, усё на гэтым слове трымаецца. Колькі людзей шукаюць, як жыць у гармоніі з сусветам. Яны абліваюцца вадой, мяса не ядуць, яшчэ нешта робяць, каб штосьці зберагчы, каб знайсці гармонію. А гармонія — яна ў слове Божым. Яна пачынаецца з тваёго сэрца. Калі ў цябе ў сэрцы ці то крыўды, ці то нянавісць, ці горыч, боль —магчыма, нават справядлівая — няма ўжо той гармоніі з сусветам і няма зменаў, бо гэтыя пачуцці раз'ядаюць знутры. Як Ісус сказаў: Валадарства Божае ў саміх вас. Калі ты пачынаеш змяняцца з сэрца, то змяняецца і ўсё астатняе. Раней, калі я наведвала маладзёжную службу ў царкве, то вельмі перажывала, што я такая непрыгожая, са скаліёзам. Плакала шмат ад гэтага. У царкве такія дзяўчаты прыгожыя, а я... Аднойчы кажу: «Божа, ну зрабі мяне хоць на кроплю такой жа прыгожай». Доўга-доўга малілася, хвілінаў пятнаццаць, звычайна ў мяне так доўга не атрымліваецца. Тады такое прыйшло: «Прыгажосць дачкі Цара ўнутры яе». Думаю: недзе я гэта ўжо чула. Ёсць такі псалом, але там не прыгажосць, а нейкае іншае слова. Але я прыняла гэта. Усё з сэрца чалавека ідзе. І ўпэўненасць, усё адтуль. Мы вельмі часта выгляд сабе малюем, антураж робім, а ўнутры гармоніі няма.

**«НН»: Дарэчы, вас не крыўдзіць слова «інвалід»?**

**ІТ:** Ды гэта ж немагчыма вымавіць: «чалавек з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі». Інвалід... Нармалёвае слова. Ну, дзякуй, што не калека, канечне! Я пра сябе кажу, што я інвалід, а вось іншых так назваць ужо баюся — а раптам чалавек пакрыўдзіцца? На самой справе, як бы ні называў, галоўнае — як ты ставішся да гэтага. А што да паліткарэктнасці, то яна часам гэтак зашкальвае ў людзей, што страчваецца цвярозасць.

**«НН»: Як да вас ставяцца людзі на вуліцах у Бабруйску?**

**ІТ:** Раней, калі я сама перасоўвалася па горадзе, у нас яшчэ было вельмі мала пандусаў. Дык нашыя хлопцы — п'яныя, цвярозыя, лысыя, валасатыя, панкі — усе дапамагалі, каго толькі ні папросіш. Ім гэта не цяжка, яны разумеюць, што трэба чалавеку дапамагчы. Нават калі сустракаеш чалавека, які насцярожана да цябе ставіцца — магчыма, ён проста сам баіцца. На самой справе, калі чалавека разварушыць, усё будзе добра.

**«НН»: Як вы думаеце, з цягам часу, гісторыі, людзі робяцца лепшымі ці горшымі?**

**ІТ:** Я думаю, што людзі заўсёды аднолькавыя. Пачытайце Апулея «Залаты асёл». Там такое ж, як і ў нас. Так што ўсё аднолькавае, проста чалавек сам па сабе мае схільнасць да таго, каб скатвацца ўніз. У расійскай мове ёсць паняцце «целомудрие», цэласны розум. Цяпер межы гэтага цвярозага розуму настолькі размытыя, што людзі не ведаюць, дзе добра, дзе кепска. Я вось цяпер размаўляю па інтэрнэце з адным хлопцам — гэта наркаман, з Алтайскага краю. Мяне ніколі тая Сібір не цікавіла. А тут сустрэўся чалавек, які кажа: «Хачу кінуць, і не атрымліваецца». Проста чалавек робіцца для цябе блізкі, і думаеш, як яму дапамагчы.

**«НН»: А вашая беларускамоўнасць — адкуль яна?**

**ІТ:** Ад Караткевіча. У сёмым класе сяброўка, суседачка, прынесла мне кнігу на расійскай мове «Каласы пад сярпом тваім». Я як пачытала... Закахалася ў гэтага Алеся Загорскага. Пачала шукаць іншыя кнігі Караткевіча — не знайшла на расійскай мове, на беларускай чытаць пачала. Вельмі цяжка было, бо ў нас у сям'і ўсё парасійску было, у школе я беларускую мову не вывучала.

Багдановіч потым мне патрапіў, «Маладзік», кніга яго. Я нават перапісвала яе. Чытаць я чытала, але не размаўляла. А потым, калі пайшла ў царкву, настолькі мяне слова Божае захапіла, то мне нічога больш не хацелася. Хіба што Дастаеўскага чытала. Калі мастацкая літаратура, то мне хацелася, каб яна была пра шляхі чалавека да Бога.

А потым проста ў малітве пачалі з'яўляцца нейкія новыя словы. Кажу: «Госпадзе, ласка твая». А сама думаю: што такое «ласка»? Потым: «Госпадзе, ты такі лагодны». А што такое «лагодны»? Пачалі беларускія словы выскокваць. Гэта адбылося ў вёсцы. Ведаеце, Бог тваё жыццё бачыць наперад. Ён ведаў, што мне гэта патрэбна, што мне гэта да сэрца.

**Гутарыў Алесь Кудрыцкі**



BACIAN.LIVEJOURNAL.COM

СКАНДАЛЫ

# Скандал у беларускай оперы

Яшчэ не сціхла гісторыя з адстаўкай кіраўніка Беларускага балета Валянціна Елізар'ева, як у Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета выспявае новы скандал. На гэты раз ён датычыць оперы.

Фан опернага мастацтва, гісторык Сяргей Русецкі напісаў ліст да міністра культуры Паўла Латушкі. Аўтар засяроджвае ўвагу на праблемах тэатра. «Гэта крык адчаю», — так характарызуе свой зварот сп.Русецкі, які ведае ў Беларускай Оперы літаральна ўсё. Русецкі за апошнія 10 гадоў наведаў оперу каля 300 разоў. Таму кожны з пунктаў ён падмацоўвае канкрэтным прыкладам.

Найперш ён вінаваціць галоўнага дырыжора Віктара Пласкіну ў некампетэнтнасці і зрыве выступленняў. Наракае на праблему з вузкім рэпертуарам і на адсутнасць беларускасці ў тэатры.

Звяртаецца і да ганаровых званняў. «Па тым, як прысвойваюцца ганаровыя званні салістам оперы, калі параўноўваць з іншымі тэатрамі і, самае галоўнае, эстраднікамі, можна меркаваць, што палітыка дзяржавы па гэтым пытанні сябе дыскрэдытавала. Або званні трэба адмяніць увогуле, або прысуджаць іх справядліва».

Хвалююць сп. Русецкага і тэхнічныя бакі арганізацыі працы тэатра. «Тузін праблем выкліканы капітальным рамонтам. Пагоршылася акустыка, з'явіліся нязручныя месцы, з якіх амаль нічога не відаць».

У інтэрнэце салідарнасць з Сяргеем паспелі выказаць дзесяткі людзей, якія маюць тыя самыя пытанні да Беларускай оперы.

«Мы, гледачы, любім тэатр, — кажа операфіл. — Таму лічым неабходным выступіць».

Адказу з Міністэрства культуры пакуль не было.

— Мы збіралі планёрку з гэтай нагоды, — паведаміла намесніца генеральнага дырэктара тэатра па працы з гледачом Зоя Юрчанка. — І па кожным з пунктаў рыхтуем адказы. Вельмі шмат у лісце Сяргея Русецкага надуманага.

**Кастусь Матушыч**

### Звольненая легендарная дырэктарка «Акадэмкнігі»

Легендарную дырэктарку кнігарні «Акадэмкніга» Соф'ю Жыбулеўскую кіраўнік Акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч звольніў без тлумачэння прычынаў, не працягнуўшы кантракт. Спадарыня Соф'я перажывае, што пасля яе сыходу кнігарня страціць самастойнасць, а на паліцах з'явіцца розная макулатура. У «Акадэмкнізе» быў найбольшы ў краіне выбар беларускіх выданняў.

**СМ, паводле «Еўрарадыё»**

# Рандэву з Іванам Жахлівым

**Іван Жахлівы ў фільме «Цар» то моліцца, то балюе, а яшчэ ўвесь час мармыча, разглагольствуе, крычыць, шэпча. Ён падобны да пачварнага разбэшчанага дзіцяці, які то палац без вокнаў ды без дзвярэй збудуе, то ляльку на кол пасадзіць, то заплача, то ў ладкі запляскае.**

Тыдзень таму, сядаючы ў цягнік Мінск — Масква, я крыху хваляваўся. Не скажу, каб гэта была боязь, але... Ну што можа адчуваць чалавек перад тым, як упершыню ў жыцці едзе наведаць славяна-азіяцкі мегаполіс, сучасны Вавілон з яго шырачэзнымі праспектамі, па якіх пралятаюць на сваіх чорных лімузінах апрычнікі ды баяры федэральнага ўзроўню, дзе па даўжэзных эскалатарах спускаюцца ў чэрава метро змрочныя орды гастарбайтэраў, а з-пад колаў цягнікоў выскокваюць пацукі памерам з парсюка? Дзе ў кожным дворыку вядуцца міні-войны паміж салаўямі-разбойнікамі ў чорных масках ды купцамі, якія наіўна спадзяюцца схавацца ад куляў, загарнуўшыся ў собалевыя футры ад «Хуга Бос»? У горад, які сваім памерам намагаецца паказаць табе, што ты — казюрка, ты — нішто.

Натуральна, расійская сталіца выявілася зусім не такой, якой яе малюе немаскоўскае калектыўнае несвядомае.

Ніякіх мядзведзяў з балалайкамі ды гарэлкі з самавараў. Масква хоць і буйны, але даволі спакойны, несумненна цікавы і па-свойму прыгожы горад. У архітэктуры Крамля адразу праглядаецца ўсходняя стылістыка, а ў храме Васіля Блажэннага зашыфраваны рэнесансныя матывы. Красная плошча, якая ўяўлялася грандыёзным пляцам, у адрозненне ад Кастрычніцкае плошчы Мінска падаецца маленькай, амаль камернай, а маўзалей Леніна выглядае не велічным мармуровым зікуратам, а мізэрным пачкам запалак, перад якім мнецца з нагі на нагу ахоўнік, усміхаючыся сваім думкам. Ад няма чаго рабіць, ён нават зляпіў маленькую снежную бабу, паставіўшы яе на слупок агароджы перад маўзалеем.

Вось тут, у ваколіцах Краснай плошчы, я і пабачыў упершыню Івана Жахлівага. Ён выйшаў ці то з музея, ці то з антыкварнай крамы і скоса, падазрона зірнуў на мяне. Перапрануўшыся ў крывавага цара, нават звычайны прадавец ці экскурсавод пакрысе пачынае весці сябе адпаведным чынам.

> Усё пераварочвае адзіная фраза: «Полацк здадзены! Палякі зайшлі з тылу, а горад ім сам дзверы расчыніў».


АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

Другі раз я сустрэўся з Іванам Жахлівым праз некалькі дзён пасля паездкі, у Мінску. У зале кінатэатра «Беларусь» не было аніводнага пустога месца. На экране шалёна варочаў зрэнкамі Пятро Мамонаў, які пераўвасобіўся ў Івана Жахлівага ў фільме Паўла Лунгіна «Цар».

У фільме расказваецца пра два гады царавання Івана Жахлівага (1566-1568), якія прыпалі на яго канфлікт з мітрапалітам Філіпам, а таксама на разгар Лівонскай вайны.

Дарэчы, каб паказаць вайну, Павал Лунгін выбраў эпізод з бітвай за Полацк і зрабіў гэта надта хітра: рэжысёр апавядае не пра крывавае ўзяцце Полацка войскамі Івана Жахлівага, а пра яго «абарону» расійцамі ад беларуска-польскага войска.

Усё пераварочвае адзіная фраза. Вой-вястун кідаецца ў ногі цару з горасным крыкам: «Полацк здадзены! Палякі зайшлі з тылу, а горад ім сам дзверы расчыніў». Расійскія ваяводы, панурыўшы галаў, вяртаюцца ў Маскву, дзе цар, за якога яны змагаліся, ужо вынес ім смяротны вырак.

Філіп, ігумен Салавецкага манастыра, едзе ў сталіцу на заклік цара. Чым бліжэй да Масквы, тым большае задуменне выклікае ў манаха тое, што ён бачыць. Перад яго вачыма паўстае крывавы балаган, масавае шаленства з царом на чале. У дзяцінстве Філіп і Іван былі сябрамі, і менавіта яго цар паставіў кіраваць царквой — каб потым забіць, зразумеўшы, што той не збіраецца танчыць пад царову дуду.

Іван Жахлівы ў выкананні Пятра Мамонава то моліцца, то балюе, а яшчэ ўвесь час мармыча, разглагольствуе, крычыць, шэпча. Ён падобны да пачварнага разбэшчанага дзіцяці, які то палац без вокнаў ды без дзвярэй збудуе, то ляльку на кол пасадзіць, то заплача, то ў ладкі запляскае. Дарэчы, Івану Жахліваму надта цікава бавіцца з дзецьмі — яны для яго як цацкі, як талісманы, накшталт нацельнага крыжыка. Праўда, калі талісман не прыносіць цудаў, цар можа яго і на сметнік выкінуць. А яшчэ ён увесь час хоча, каб яго любілі — не толькі апрычнікі, але і мітрапаліт Філіп, і народ, і Бог. Ды толькі сам цар любіць няздатны, а малітвы ягоныя — дыялог з самім сабой. Іван Жахлівы падобны да ката і блазна адначасова. Ягоная душа не проста блукае — яна мітусіцца, нібы ў клетцы.

Мітрапаліт Філіп у выкананні Алега Янкоўскага (гэта была ягоная апошняя роля ў жыцці) — гэта сімвал царквы, якая лічыць царом Бога, а не цара — Богам. Ён супрацьпастаўляе простую любоў і чалавечнасць мудрагелістым філасофстваванням Івана Жахлівага, у якіх тэалогія мяшаецца з псіхапатыяй. Чым далей, тым больш відавочна, што для цара не існуе іншых людзей — толькі ён ды Бог, ды і той не слухаецца. Адзін цар, зусім адзін.

«Дзе мой народ?» — істэрычна скрыгоча зубамі, увесь счарнелы, Іван напрыканцы фільма, калі сядзіць адзін пасярод катавальнага мястэчка. Галоўны кашмар дэспата — прачнуцца і пабачыць, што навокал нікога няма.

Шпацыруючы па Краснай плошчы, я заўважыў на пляцы нейкую недарэчную канструкцыю — ці то каменны басейн, ці то трыбуну. З глыбіняў памяці ўсплыла напаўзабытая назва «Лобнае месца». Адсюль некалі зачытвалі царскія загады — каго на плаху, а каго ў кайданы. Тут і галовы адсякалі.

У некалькіх кроках ад Лобнага месца — цудоўны сабор Васіля Блажэннага, які, між іншым, збудавалі на загад Івана Жахлівага. Кажуць, дойліду пасля выкалалі вочы, каб той больш не збудаваў нічога падобнага. Так і стаіш паміж Лобным месцам ды саборам, у самым сэрцы Расіі.

**Алесь Кудрыцкі**

# Цар і сантэхнік

Памылкай будзе разглядаць фільм «Цар» як гістарычны. Фільмы пра цара Івана ў Расіі выходзяць палітычныя, незалежна ад жадання аўтараў. Бо Іван Жахлівы на стагоддзі перадвызначыў шлях развіцця Расіі. Першы геапалітык імперыі, ён «прабіваў акно» да Балтыкі. Праўда, у той раз беларусы яго ад мора адкінулі.

Знішчыў Казанскае ханства, адкрыўшы шлях да каланізацыі Сібіры. Прыяднаў вестэрнізаваную Наўгародскую рэспубліку і здушыў сепаратызм.

Дыпламатычны стыль Івана Васільевіча дагэтуль жывы ў каментарыях Пуціна пра гальштук Саакашвілі, у заявах Лаўрова. Дый пачутыя ў фільме праклёны на адрас караля Жыгімонта і здраднікаў, «купленых на наўгародскія грошы», гучаць вельмі сучасна. Калі замяніць польскага караля на амерыканскага прэзідэнта, а наўгародскія грошы на заходнія гранты.

Першы фільм пра Івана IV здымалі пры Сталіну. Паказаць гістарычную апраўданасць метадаў сталінскай улады ў ім не выйшла — сам матэрыял паўстаў супраць такой ідэі. У часы застою быў зняты другі — камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію». Жарцікі з рэлігіі, маразм і распуста начальства, некампетэнтнасць «цара»... Брэжнеўская эпоха паўстае ва ўсёй прыгажосці.

Стваральнікі самага новага фільма пра цара ўсяляк намагаюцца сысці ад разважання пра сучасныя праблемы Расіі — настолькі ўніверсальнае шэкспіраўскае зло ўвасабляе Іван. Гэта анты-Лір: цар-вар'ят, які распадаецца на чалавека і ўладара, ката і яго ж ахвяру, прагматычнага палітыка і містыка. Дэспатычнае ў ім нашмат мацнейшае за асабістае: «Як чалавек я можа і грэшны, але як цар — бязгрэшны». Хто з дыктатараў не суцяшае сябе той самай думкай?

> Служыць цару, спадзеючыся яго выправіць? Немагчыма.

Яго антыподы ў фільме — высокадухоўны праваслаўны мітрапаліт Філіп і яго пляменнік, ваявода-патрыёт, — спрабуюць выйграць у Івана па ягоных жа правілах. Служаць яму, спадзеючыся яго выправіць. Але іх рэцэпты не лечаць. Станоўчы ваявода Колычаў няблага б глядзеўся і ў расійскім баевіку пра чачэнскую вайну — варта толькі памяняць уніформу. А Філіп усё ратуе душу цара, заклікае «пакаяцца», «не ліць кроў». Але цар ужо даўно не чалавек, а частка дзяржаўнай сістэмы, якую не разбурыш простай асабістай заменай. Гэта добра бачна ў сцэне, дзе світа этап за этапам апранае Івана ў царскія шаты. І скукожаны багамолец ператвараецца ў грознага дэспата. Цар перамагае Філіпа адным кіўком: дае дысідэнту ўладу судзіць «ворагаў дзяржавы». І Філіп губляецца, не знаходзіць выйсця з пастаўленай пасткі.

Мітрапаліт гіне, здабыўшы маральную перамогу. Манастыр з манахамі, што схавалі яго цела, паляць апрычнікі. Дысідэнцкі шлях больш нікуды не вядзе. «Тут усю сістэму мяняць трэба», — казаў безыменны сантэхнік.

**Сяргей Мікулевіч**

# Расія: паміж шаленствам і святасцю

**«Цар»**

Расія, 2009, каляровы, 116 хв.

**Рэжысёр:** Павал Лунгін

**Ролі выконваюць:** Пятро Мамонаў, Алег Янкоўскі, Юры Кузняцоў, Аляксандр Дамагараў.

**Жанр:** Гістарычная трагедыя

**Адзнака:** 7 (з 10)




1565 год. Разгар Полацкай вайны. Цар Іван IV, зляканы ўяўнымі і сапраўднымі ворагамі, уводзіць апрычніну і залівае Масковію крывёю. Мітрапаліт Філіп, сябра дзяцінства Івана, уздымае голас за літасць і праўду...

Гістарычная трагедыя Паўла Лунгіна прасцейшая за знакамітую стужку Сяргея Эйзенштэйна. Сутыкненне дабра і зла падкрэсленае. Святло, сонца і кветкі ў манастыры; цемра, плаха і стогны — у катавальні. Як героі-панфілаўцы, стаяць ваяводы, баронячы захоплены ў беларусаў Полацк.

Зямлістыя, каржакаватыя, быццам выкапаныя з глыбінь апраметнай царскія апрычнікі. І адухоўленыя манахі, якіх паляць жыўцом.

Гэтая гістарычная стужка і трымаецца на двух постацях — Пятру Мамонаве і Алегу Янкоўскім. Толькі Мамонаў здолеў непераўзыдзена сыграць цара-параноіка. І толькі Янкоўскі з найвялікшай акторскай мудрасцю і пакорай паказаў на экране штодзённую жыццёвую святасць.

Лунгін раскрывае нам галоўную расійскую тайну, запачаткаваную ў крывавыя маскоўскія часы. У краіне, якая нат дасягненні заходняй цывілізацыі пераўтварае ў катавальніцкія механізмы, апошняя абарона ад самадурства ўлады — Бог, які дзейнічае праз сумленне. А барацьба ідзе за чалавечыя душы: з кім чалавекі — з царом зямным, ці Царом Нябесным? І вагаецца Расія паміж шаленствам і святасцю.

«Дзе мой народ?» — разгублена пытаецца цар.

Народ схаваўся.

**Андрэй Расінскі**

# Жахлівы чалавек і грозны цар



У Беларусі з яе ампутаванай гістарычнай памяццю для большасці насельніцтва ён — персанаж з вясёлай савецкай камедыі, які «Астрахань браў, а Шпака — не». Для тых, хто вывучаў гісторыю па кнігах Уладзіміра Арлова, ён — Іван Жахлівы, знішчальнік Полацка і заваёўнік беларускіх земляў.

Іван IV Васільевіч нарадзіўся ў шлюбе вялікага князя маскоўскага Васіля III і Алены Глінскай. Па бацькоўскай лініі паходзіў з дынастыі Івана Каліты, па матчынай — ад Мамая. Сам сябе Іван IV лічыў нашчадкам рымскага імператара Аўгуста.

Яго заваёвы, у выніку якіх тэрыторыя Масковіі павялічылася ўдвая, стварылі пра яго легенды. Між тым, сам каварны Іван амаль ніколі не ўдзельнічаў у паходах.

Сярод насельніцтва ВКЛ маскоўскі цар Іван Васільевіч быў вядомы альбо як «Маскоўскі», альбо як «Тыран».

Існуе меркаванне, што Іван IV быў псіхічна хворым, чым і тлумачыцца яго жорсткасць. Першага чалавека ён прыгаварыў да смерці ў 13 гадоў, аднак гэта было хутчэй прыкметай часу і моцнай улады. Усё кіраванне цара Івана прынесла менш ахвяр, чым адна Варфаламееўская ноч. Рэпутацыю цар атрымаў хутчэй ад таго, што не грэбаваў асабістым удзелам у забойствах і гвалце.

Да беларускіх земляў у Івана было стаўленне адназначнае — яны павінны былі далучыцца да Масквы. Прычым не па рэлігійнай прыкмеце (з царквой у яго былі церці), а па гістарычнай. Выводзячыся ад Рурыка, ён лічыў сваім абавязкам «вярнуць» Полацк.

Такім ён і ўвойдзе ў нашу гісторыю — заваёўнікам.

**Алесь Пілецкі**

# Кулінковіч: Калі ты забаронены, ты не развіваешся




**Вечна маладому гурту «Нейра Дзюбель» споўнілася дваццаць гадоў. Карэспандэнт «НН» гутарыць з яго лідэрам Аляксандрам Кулінковічам.**

**«Наша Ніва»: Аляксандр, як акрэсліце гэтыя гады ў року адным словам?**

**Аляксандр Кульлінковіч:** Раздзяўбайства. Гэтак, па-раздзяўбайску, мы і канцэрты ладзілі, гэтак з выгаднымі прапановамі без прадусараў абыходзіліся, гэтак жа і альбомы пісалі... Але з іншага боку, за раздзяўбайства нас і любяць. Бо ў нашым раздзяўбайстве, на маю думку, ёсць трохі шчырасці.

**«НН»: Вас па-ранейшаму слухаюць?**

**АК:** Сусветнай папулярнасці, аб якой марылася раней, ужо не хочацца. Мяне задавальняе стабільная павага да нашых песняў. Мы зрабіліся больш унутраным гуртом, чым нават N.R.M. Тыя калі-нікалі адведваюць Польшчу, мы ж у Расіі апошні раз былі гадоў пяць таму. У нас усё засталося на ўзроўні «паклікалі». Паклікалі ў Наваполацк — прыехалі, у Гомель— прыехалі. Хіба прэса стала пра нас менш пісаць. Але інтарэс слухачоў, дзякаваць Богу, быў заўсёды.

## Рок сёння пад полем

**«НН»: Можа, проста мінула цікавасць да рок-музыкі? Бо на дварэ даўно ўжо не канец 1980-х.**

**АК:** Параўноўваць рок-музыку ўзору 1989-га і 2009-га — тое самае, што параўноўваць прэсу гэтых перыядаў ці тэлебачанне. З сярэдзіны 90-х у нас ідзе масіраваная прапаганда попа. Усё папсее і ацэнзурваецца. Людзей прывучылі думаць па-іншаму, ім сталі прапагандаваць іншую, легкаважкую музыку.

У краіне стараюцца не заўважаць рок, асабліва нераскручаны. Масмедыя, асабліва дзяржаўныя, каго не могуць ігнараваць — напрыклад, J-Морс — неяк прапускаюць, а каго могуць не заўважаць — не заўважаюць. Балазе ёсць выключэнні, як канал СТВ, якія не патураюць гледачу, а працуюць для яго.

**«НН»: Але ж тэндэнцыя ўціскання ў рамкі фармату па ўсім свеце...**

**АК:** Не зусім так. Сапраўды, у Расіі ўсё тое самае. Дзе ўсе тыя каманды, што не злазілі з тэлебачання, дзе «Ва-БанкЪ» і «Агата Кристи»? А вось ва Украіне, дарэчы, не збочылі на гэты шлях: і цяпер там, маючы з Расіяй аднолькавыя стартавыя дадзеныя, прыйшлі да абсалютна іншых вынікаў. Паглядзіце, колькі там рока і вартых тэлеперадач.

Рок — усё ж не мода, гэта рэч больш аб'ёмістая і шматпланавая. І як былі людзі, што цягнуцца да больш змястоўнай музыкі (аналітычнай прэсы ці тэлебачання), так яны і засталіся. Нічога страшнага ў сённяшняй сітуацыі няма. Проста цяпер рок вярнуўся туды, адкуль выходзіў: калі не ў падполле, дык пад поле.

## З Праляскоўскім мы сабе не здрадзілі

**«НН»: Мінула больш года пасля вашага паходу з Алегам Хаменкам і Лявонам Вольскім да дзяржідэолага Праляскоўскага. Ці палепшылася становішча «забароненых гуртоў»?**

**АК:** Вядома. Цяпер забароны няма, можна спакойна ладзіць канцэрты. Адно выявіўся парадокс: калі мы былі забароненыя, нас запрашалі не менш. Але нас запрашалі не як музыкаў, а як «забаронены гурт з Беларусі».

Цяпер людзі ідуць толькі на нашу творчасць, што мне больш да сэрца. Мне падабаецца, калі мяне любяць ці не любяць за мае песні, а не за тое, які сцяг мне падабаецца больш. Так што да Праляскоўскага мы пайшлі не па грошы, як гаварылі навокал, — наадварот, у грашах мы нават страцілі. Проста калі ты забаронены гурт, табе не трэба нічога рабіць, развівацца. Дастаткова быць забароненым. З іншага боку, гэтым учынкам мы сабе не здрадзілі: як гралі — так і граем, што спявалі — тое і спяваем. Без цэнзуры.

**«НН»: А з'едлівыя тэксты — гэта пазіцыя?**

**АК:** Тое, што мы спяваем, гэта — эмоцыі. Перажыванні. Нейкія штукі, якія адбываюцца ў грамадстве, вядома, уплываюць на нас. Але мы не пішам песні пратэсту, песні ў лоб. Нават песня «ППРБ». Гэта жартаўлівы твор. Мяне торкнула гучанне абрэвіятуры, што была ва ўсіх на вуснах, «пэпээрбэ». Якая тут палітыка? Проста ёсць рэчы навокал, якія мяне як творцу торкаюць. Спадабаецца — напішу пра адронны калайдэр.

## Саладуха не крыўдуе

**«НН»: Адкуль вашая фішка, маем на ўвазе перапрацоўкі ў панкстылі поп-шлягераў («Чужая мілая», «Вологда», «Черные Глаза»...)?**

**АК:** У рэміксавыкананні ёсць нешта дзіцячае: як дамаляваць хвацкія вусы Леніну ў падручніку. Мне даспадобы перапяваць чужыя песні. Новага я не перапяваю, люблю настоеныя на гадах хіты, якія перадаюць эпоху. І песням карысць: ім даецца другое жыццё. А першыя выканаўцы? Прынамсі, Саладуха і Ханок, што спрычыніліся да «Чужой мілай», не крыўдуюць.

**«НН»: Плятуць, што вы пад «Рамштайн» косіце?**

**АК:** Мы гэтага не хаваем. Разумееце, у альбоме ў адной ці двух песнях мы проста да зарэзу павінны закасіць пад нейкі гурт і яшчэ выканаць якісьці слязлівы шлягер у стылі амерыканскага рок-попа. Дзеля нашай і вашай радасці.

## Караткевіч натхніў спяваць па-беларуску

**«НН»: А як маюцца вашыя сумольныя праекты пасля супрацоўніцтва з Вольскім у «Крамбамбулі»?**

**АК:** Ды супольна неяк апошнім часам не зрастаецца. Быў супольнік на вершы Караткевіча, песня «Скрыпка дрыгвы». Хоць альбом не выйшаў, але трыб'ют меў свой плён, бо дзякуючы яму я пачаў спяваць па-беларуску.

У песні ж як? Або ты спяваеш на мове, на якой думаеш, або песні выйдуць мертваватыя. Дык вось, хоць я расійскамоўны, але настолькі прасякнуўся паэзіяй Караткевіча, што папрасіў у Вольскага яшчэ колькі беларускіх кніг пачытаць. І так захапіўся, што калі-нікалі пачаў думаць па-беларуску. І паляцела, не спыніць-не стрымаць: пачаў складаць і гуляцца словамі...

**«НН»: Як будзеце святкаваць 20-годдзе?**

**АК:** Запрашаю: 25 лістапада, у сераду, клуб «Рэактар», 19.00. Будзе трохгадзінны юбілейны канцэрт «Нейра Дзюбеля» з усімі выцякаючымі: зайграем самае забойчае, што было за апошнія дваццаць гадоў. Спецыяльна на гэты вечар мы запрасілі старых сяброў: Макса Івашына, нашага колішняга клавішніка, Вольгу Самосік і Алега Хаменку. І можа, можа быць (калі будзе мецьчас) да нашых святочных спеваў далучыцца Лявон Вольскі.

**Гутарыў ЛК**

### Гурт «Нейра Дзюбель»

заснаваны ў 1989. Выпусціў 17 альбомаў, сярод якіх класіка белрока: «Умные вещи» ды «Охотник и Сайгак». У 1999 «НД» атрымаў званне найлепшага гурта Беларусі — «Рок-карону». На «Рок-каранацыі-2005» першы беларускамоўны альбом «НД» «Танкі» быў прызнаны альбомам года. А ў 2008 тое ж адбылося з альбомам «STASI».

Граюць нервова, апантана. У музыцы дрэйфуюць ад постпанка да хардкора. З фірмовых страў — перапеўкі шлягераў у панк- і метал-апрацоўках.

### «Нейра Дзюбель» у «Рэактары»

25 лістапада ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) пройдзе трохгадзінны канцэрт «Нейра Дзюбеля». Гурт выканае найлепшыя хіты за дваццаць гадоў. Чакаецца ўдзел Лявона Вольскага, Алега Хаменкі, Макса Івашына, Вольгі Самусік. Пачатак а 19-й.

## СЦІСЛА

### Сяргей Міхалок: Трымайцеся каранёў сваіх!

Гурт «Ляпіс Трубяцкой» запісаў песню «Шпак» для трыб'ют-альбома «Машынапіс», прысвечанага 40-годдзю расійскага калектыва «Машина Времени». Прэзентацыя альбома прайшла 11 лістапада ў Маскве. Чаму каманда абрала менавіта гэту песню, распавядае Сяргей Міхалок: «Таямнічым чынам усё, што выконваецца беларускімі артыстамі, пачынае разглядацца ў кантэксце нашай палітычнай атмасферы. Вось і песня «Шпак» атрымліваецца ледзьве не пра гурт «Ляпіс Трубяцкой», які, нягледзячы на магчымасці, ніколі не з'язджаў з роднага Мінска, трымаўся сваіх каранёў».

### Дудараў піша працяг «Белых росаў»

Драматург Аляксей Дудараў працуе са сцэнарам працягу фільма «Белыя росы». Пра гэта паведаміў народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук. Плануецца, што Гарбук, які сыграў у фільме «Белыя росы» ролю старэйшага сына Андрэя Ходаса, здымецца і ў працягу стужкі. Хто будзе рэжысёрам, пакуль невядома.

### Антыэпідэмічны абрад прызнаны каштоўнасцю

Міністэрства культуры пастанавіла ўключыць у Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі калядную гульню для незамужніх дзяўчат і нежанатых юнакоў «Жаніцьба Цярэшкі» (Лепельскі раён). Таксама ў спіс трапіў абрад «Намскі Вялікдзень» вёскі Аброва Івацэвіцкага раёна. Прычынай з'яўлення такога свята стала збаўленне той вёскі ад эпідэміі ў пачатку XX стагоддзя. Паводле падання, жыхары сaткалі за адну ноч спецыяльны ручнік і разам з абразом Божай Маці прайшлі хрэсным ходам кругом вёскі, каб абараніцца ад мору. Каштоўнасцю прызнаная і тэхналогія стварэння майстрамі Круглянскага раёна драўляных музычных народных інструментаў.

### Памёр акцёр Анатоль Жук

19 лістапада на 61-м годзе жыцця раптоўна памёр акцёр Тэатра юнага гледача, заслужаны артыст Беларусі Анатоль Жук. Як паведамілі ў пракуратуры Мінска, вечарам 19 лістапада Анатоль Жук знаходзіўся ў сваёй кватэры са знаёмай. Прычыны смерці высвятляюцца, прызначана экспертыза. Анатоль Жук працаваў у Тэатры юнага гледача з 1975 года.

**Паводле БелаПАН, БЕЛТА**




## ФУТБОЛ

### Вялікі зімовы футбол

**2 снежня (серада)** пройдзе матч 5-га туру Лігі Еўропы паміж БАТЭ (Барысаў) — «Бенфіка» (Лісабон). **Стадыён «Дынама», пачатак а 20-й**, білеты: 10 000, 20 000, 30 000. Пасля 4-х тураў у нашай групе наступнае становішча: Бенфіка — 9 балаў, Эвертан — 6 , БАТЭ — 4, АЕК — 4. 17 верасня ў Лісабоне БАТЭ прайграла «Бенфіцы» — 0:2.

## КАНЦЭРТЫ

### Neuro Dubel у «Рэактары»

**25 лістапада а 19-й у клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** — канцэрт Neuro Dubel'я, прысвечаны 20-годдзю гурта. Пры ўдзеле **Лявона Вольскага**, **Алега Хаменкі**, **Вольгі Самусік**, **Максіма Івашына** і іншых. **Глядзі старонку 11.**

### «Разбітае сэрца пацана» і «Вецер у галаве»

Сумесны канцэрт гуртоў «Разбітае сэрца пацана» і «Вецер у галаве» адбудзецца **25 лістапада ў клубе R-klub (вул.Сурганова, 26)**. **Пачатак а 19-й.**

### Стары Ольса

**28 лістапада ў к/з «Мінск»** — канцэрт «Старога Ольсы», прысвечаны 10-годдзю гурта. **Пачатак а 19-й.**

### Алесь Камоцкі ў Швабах

Творчая сустрэча з Алесем Камоцкім адбудзецца **ў сельскім Доме культуры вёскі Швабы Лагойскага раёна 27 лістапада**. **Пачатак а 18-й.**

### Аўтабаны і менестрэлі

**2 снежня а 19-й на сцэне Тэатра лялек — этна-трыа «Тройца»** з праграмай «Аўтабаны і менестрэлі».

## ІМПРЭЗЫ

### Галерэя «Ў» запрашае

**25 лістапада а 19-й** — «Лічбавая і папяровая будучыня кніг». Дыскусія з удзелам ставаральнікаў часопіса «Маналог»: Аляксеем Андрэевым, Адамам Глобусам і Аляксандрам Барташэвічам. **26 лістапада** — «Он-лайн трансфармацыя кнігі». Крысціна Карчэўская, вэб-рэдактар мультымедыячасопіса «34», раскажа пра он-лайн трансфармацыі ў кніжным сусвеце. **28 лістапада а 18-й** — украінскі літаратурны праект «Бочка». Выступаюць маладыя ўкраінскія літаратары. Праводзіць вечарыну Югася Каляда (Гомель). **29 лістапада а 20-й** — «Надрукуй сябе сам(а): вечар размоваў, выставы і кіно пра зіны». Вядучыя: Саша &Таня. **Адрас кнігарні«Ў»галерэі: пр. Незалежнасці, 37а.**

### Фестываль беларуска-літоўскай салідарнасці ў Вільні

**28 лістапада а 18-й** запрашаем Вас на фестываль беларуска-літоўскай салідарнасці, што пройдзе **ў клубе «Artistai» (Šv. Kazimiero g., 3), у самым цэнтры віленскага Старога горада**. У фестывалі сваю творчасць прэзентуюць музыкі і гурты з Літвы ды Беларусі, якія бралі ўдзел у ранейшых канцэртах салідарнасці. На суд грамадскасці будзе прадстаўленая агульная кружэлка ўсіх выканаўцаў «169 км». Уваход вольны.

### Belly dance

**6 снежня ў канцэртнай зале «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5)** пройдзе фінальны этап чэмпіяната Еўропы па belly dance. **Пачатак а 17-й.**



### Памяць пра Другую сусветную вайну

**26 лістапада** адбудзецца прэзентацыя вынікаў даследавання «Памяць пра Другую сусветную вайну ў гарадскім ландшафце Усходняй Еўропы», а таксама дыскусія па тэме даклада. **Пачатак у 18.30. Месца прэзентацыі: гатэль Crowne Plaza па адрасе вул. Кірава, 13, зала Princess I.** Выступоўцы: Аляксей Ластоўскі, кандыдат сацыялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, Андрэй Казакевіч, PhD, галоўны рэдактар часопіса «Палітычная сфера», Раса Балачкайтэ, PhD, дацэнт Універсітэта Вітаўта Вялікага (Каўнас, Літва). Ласкава запрашаем усіх зацікаўленых!

### Цар Ірад у Гістарычным музеі

**Да 9 студзеня 2010 года кожную суботу ў Нацыянальным гістарычным музеі (вул.Маркса, 12)** праводзяцца батлеечныя спектаклі. **Ад 12.00 да 16.00, кожную гадзіну** можна пабачыць традыцыйную калядную пастаноўку «Цар Ірад». Кошт білета для дарослых і дзяцей — 2200 рублёў. **25 лістапада ў 19.00** у музеі пройдзе танцавальны марафон. На працягу гадзіны гурты старадаўняй музыкі «Пераплут» і «Гальярда» з тэатрам «Гістрыён» пакажуць праграму «Гістарычны танец». Таксама адбудуцца майстар-класы па традыцыйных і сярэднявечных танцах. Кошт білета: для дарослых — 2200 рублёў, для дзяцей — 1100 рублёў.

### Ад неба на паўметра

**26 лістапада ў ДК МАЗа (Партызанскі пр., 117а)** пройдзе этна-фэст «Ад неба на паўметра-2009». Мэта фэсту — папулярызацыя беларускіх музычных традыцый, падтрымка маладых калектываў і выканаўцаў, якія працуюць ў жанры народнай музыкі. **Пачатак а 18-й.**

### Басданс

**29 лістапада ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі (Старавіленскі тракт, 41)** пройдзе канцэрт танцавальнага клуба «Басданс» з праграмай «Фолк-экспрэс: Мінск-Берлін-Парыж-Мадрыд-Рым-Эдынбург-Дублін-Нью-Ёрк». **Пачатак а 17-й.**

### «Святадухаўская царква: яе месца і роля ў гісторыі Мінска»

Лекцыю на такую тэму **27 лістапада ў грэка-каталіцкім клубе інтэлігенцыі імя Святога Кірылы Тураўскага (вул.Арджанікідзэ, 6)** прачытае гісторык Уладзімір Дзянісаў. **Пачатак у 19:00.**

## ВЫСТАВЫ

### Фатаграфіі 1969-2009 гадоў

Фотавыстава Ігара Барсукова «Фатаграфіі 1969-2009 гадоў» адкрыецца **27 лістапада а 18-й у галерэі «Мір Фота» (вул.Прытыцкага, 10)**. **Выстава працуе да 20 снежня.**

### У аб'ектыве — случчане

**У Доме-музеі I з'езда РСДРП (пр.Незалежнасці, 31а)** працуе выстава фотаздымкаў Ларысы Салодкінай «У аб'ектыве — случчане».

### Спосабы гарадскога картаграфавання: досвед flaneuse?

**У Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (вул. М.Багдановіча, 7а) да 31 снежня** прапануюць наведаць цыкл фотавыставаў, расцягнутых у часе. «Flaneuse» (назоўнік жаночага роду, утвораны ад французскага дзеяслова flaner — шпацыраваць) ужо даўно даступны досвед фланіравання — самотнага шпацыравання па гарадской прасторы вуліцаў, крамаў, паркаў, кавярняў і пляцаў. Што бачыць жанчына з фотакамерай, шпацыруючы па горадзе, што яна адчувае, месцячы камеру паміж сабой і ўсім тым, з чым яна сутыкаецца?

## ТЭАТР

**26 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Сястра мая Русалачка»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Шлях у Царград»
**Музычны тэатр** — «Юнона» і «Авось»
**Купалаўскі тэатр** — «Дзеці Ванюшына»

**27 лістапада**

**Тэатр юнага гледача** — «Пацалунак ночы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Ізноў між намі кажучы»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Музычны тэатр** — «Юнона» і «Авось»
**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

**28 лістапада**

**Тэатр імя Горкага** — «Каштанка»
**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Музычны тэатр** — «Айбаліт-2002»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Музычны тэатр** — «Кажан»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»

**29 лістапада**

**Тэатр лялек** — «Чароўная лампа Аладзіна»
**Тэатр імя Горкага** — «Царэўна-жабка»
**Музычны тэатр** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Музычны тэатр** — «Марыца»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»

**30 лістапада**

**Купалаўскі тэатр** — «Чычыкаў»

## КІНААФІША

# Дзявочы раман з вампірам

**Прыцемкі. Сага. Поўня** (The Twilight Saga: New Moon)

ЗША, 2009, каляровы, 130 хв.

**Рэжысёр:** Крыс Уэйц

**Ролі выконваюць:** Крыстэн Сцюарт, Роберт Пацінсан, Тэйлар Лотнэр, Эшлі Грын, Пітэр Фасінэлі

**Жанр:** Вампірская меладрама




Бела Свон, якая ў папярэдніх «Прыцемках» развіталася са сваім крывасмочным сябрам, знаёміцца з небяспечным Джэйкабам Блэкам. Дзявочае сэрца разрываецца паміж арыстакратам-вампірам і мускулістым пярэваратнем…

«Прыцемкі» б'юць рэкорды праглядаў. Маладыя гады, маладыя жаданні... Фільм — экранізацыя мыльнай оперы Стэфані Мэер на вампірскую тэму.

Вампірызм даўно стаўся метафарай сэксуальнасці, ваўкалакі дэманструюць лютую хэнць.

Раней уся гэта міжвідавая гібрыдызацыя заставалася ў межах тайных забаваў цётак. Цяпер надышла чарга падлеткаў.

Сэксапільны Роберт Пацінсан, накачаны Тэйлар Лотнэр, барацьба за дзявочую руку і плоць, абяцанне вечнай любові — што яшчэ трэба для кінашчасця?

**Андрэй Расінскі**

# Колькі каштуе ялінка

Мінскія крамы пачалі сезон пераднавагодняга гандлю. Першымі адкрылі тэматычныя аддзелы ГУМ, ЦУМ, «Кірмаш» і ГД «На Нямізе».

Прыгожая зялёная ялінка вышынёй у метр каштуе ад 50 да 100 тысяч. Можна набыць і за 29 тысяч — акуратненькую 60-сантыметровую. Ці за 555 тысяч — трохметровую штучную хвою, калі заробак і столь дазваляюць. Ёсць нават чорныя елкі, хаця я б не хацела тлумачыць дзеткам, чаму наша ялінка пачарнела.

Пацеркі на елку каштуюць ад 3700 да 6500, гірлянды — ад 3600 да 10 600, верхавіна — ад 7500 да 20 тысяч, вяршаліна-зорка — 10180. Навагоднія шарыкі можна набыць нават па 800 рублёў за штуку. А тыя, што памерам з футбольны мяч, каштуюць па 29 480 рублёў. Ёсць у продажы і штучны снег.

Галоўнае — не чакаць пакупкі да 31 снежня, бо ў апошнія дні года ў крамах будзе вэрхал і вялізныя чэргі.

Хоць за акном пакуль і снегу няма, але да Новага года засталося ўсяго 40 дзён.

**Настасся Шамрэй**



# «Вялікі брат» ад МТС

Аператар мабільнай сувязі МТС запусціў у тэставым рэжыме новыя паслугі — «Сям'я пад наглядам» і «Мабільныя супрацоўнікі». Дзве прапановы амаль аднолькавага кшталту выклікалі хвалю абурэння.

Паслугі дазваляюць вызначыць месцазнаходжанне карыстальніка тэлефона па бліжэйшых базавых станцыях.

«Сям'я пад наглядам» павінна дапамагаць бацькам, якія хвалююцца пра сваіх дзяцей, атрымліваць інфармацыю, дзе тыя знаходзяцца. Зрэшты, і раўнівыя жонкі змогуць праверыць, ці сапраўды муж адправіўся на начную рыбалку.

«Мабільныя супрацоўнікі» — тое ж самае, але для кіраўнікоў кампаній, якія адсочваюць, дзе знаходзяцца іх падначаленыя. Тэставая бясплатная эксплуатацыя «Сям'і» працягнецца месяц, а «Супрацоўнікаў» — два месяцы.

### Дзе Саша?

У першыя ж гадзіны пасля анансавання паслугі МТС атрымалі столькі запытаў на падключэнне, што абсталяванне не вытрымала нагрузак. Першую ноч абаненты атрымлівалі дзесяткі аднолькавых паведамленняў.

МТС узялі перапынак на дзень, а пасля паслуга запрацавала як мае быць. На запыт кшталту: «Дзе Саша?» цяпер прыходзіць адказ: «Дзіця Саша знаходзіцца на скрыжаванні пр.Незалежнасці і вул.Валгаградскай». Памылка ў адлегласці звычайна складае 100—300 метраў. Гэта ў Мінску. У раённых цэнтрах паслуга працуе горш, бо базавых станцый там знаходзіцца даволі мала.

### Жыццё «за шклом»

Галоўная прэтэнзія людзей да аператара — у лёгкасці падключэння паслугі. Калі чалавек актывізуе сабе паслугу і атрымае асабісты код сям'і, яму будзе дастаткова ўзяць літаральна на хвіліну тэлефон сваёй «ахвяры», каб даслаць смс-паведамленне, якое павінна складацца з дзесятка сімвалаў. Усё! Ніякіх пісьмовых заяваў і дазволаў. Дастаткова аднаго паведамлення.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Непрадуманасць працэдуры падключэння можа выставіць асабістае жыццё абанентаў на агляд нядобразычліўцам.

У Расіі, дзе падобную паслугу МТС ужо запусцілі, абанент атрымае спецыяльнае смс-паведамленне з прапановай, ці згодны ён, каб пэўны чалавек мог адсачыць яго месцазнаходжанне. Калі ён згаджаецца, паслуга актывізуецца. Не — дык не. Кошт аднаго запыту ў Расіі складае 10 расійскіх рублёў (гэта каля 950 беларускіх рублёў).

У Швецыі ўвогуле патрабуецца пісьмовая згода абанента, нават непаўналетняга. Пакуль дзіця не падпіша адпаведную паперу, бацькі не змогуць атрымліваць смс-паведамленні пра яго месцазнаходжанне.

**Ягор Марціновіч**

### РЭАКЦЫІ ЧЫТАЧОЎ НА NN.BY

А вось дэмаграфія будзе ў мінусе, бо калі кожная жонка даведаецца, дзе муж начуе... гэта будзе страшна. Колькасць разводаў у разы скокне.

**Алесь**

А чаго баяцца?! Бог і так нас бачыць ва ўсёй красе...

**МТС**

Згодзен! Жаніцца не варта зараз.

**Яўмен са Старобіна**

Чалавеку, якому няма чаго хаваць ад сваёй другой паловы, гэтая паслуга не страшная.

**Siarozhka**

Ну, чорт яго ведае... З аднаго боку так, мне няма чаго хаваць, а з другога — неяк непрыемна адчуваць за сабою кантроль.

**Анатоль**

Заўсёды ж магчыма здрадзіць аднаму аператару і перайсці да іншага. І, напрыклад, зусім немагчыма адсачыць знаходжанне абанента гарадскіх тэлефонаў і таксафонаў.

**Масяня**

Ужо занесла свайго мужа як дзіця #1 (што недалёка ад ісціны). Памылка — 200 м да паўднёвага захаду. Някепска. Карачун вам, мужыкі.

**Інга**

Калі жонка не сочыць за сабою, яна сочыць за мужам.

**Пэрыс Хілтан**

А мне здаецца, гэта самае сапраўднае парушэнне правоў чалавека. Кожны мае права на асабістую свабоду, а тут яе проста пазбаўляюць.

**Sarah Connor**

ЯКАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

# Як выбіраць гранаты

У саспелага граната скурка трошкі падсушаная і (увага!) нібыта абцягвае зерне.

Унутры граната — 200, а то і ўсе 300 сочных зярнятак. Яны будуць смачнымі і карыснымі, калі гранат выспеў непасрэдна на дрэве. Знятая раней часу садавіна таго не дакажа.

Спелы гранат павінен быць сухім звонку і сакавітым усярэдзіне. У саспелага граната скурка трошкі падсушаная і (увага!) нібыта абцягвае зерне.

Калі ж скарыначка гладкая і не падсушаная, значыць гранат сарвалі з дрэва зялёным. Яго насенне можа быць чырвонага колеру, аднак чырвоны ў дадзеным выпадку не значыць «салодкі».

Яшчэ адзін момант. Зазірніце ў тое месца, дзе ў граната была кветка: нічога зялёнага ў саспелай садавіны там быць не павінна.

Якасны гранат павінен быць цвёрдым навобмацак. Калі мяккі, значыць быў пашкоджаны: пабіты ў дарозе, падмарожаны ці падгніў.

### Чаму карысна есці гранаты

Гранат — адзін з самых вітамінных гатункаў садавіны на зямлі. А карысна ў ім... абсалютна ўсё: і скурка, і мякаць, і сок, і кветкі дрэва, і карані...

Так, адвар са скуркі пладоў граната дапаможа ў выпадку запалення кішэчніка ці страўніка, падтрымае ў барацьбе з дызентэрыяй і гемароем. Сок граната, з высокім утрыманнем вітаміну С, падмацуе арганізм. Гранаты выклікаюць апетыт, умацоўваюць сэрца.



Яшчэ сок граната рэкамендуецца ў выпадках малакроўя, бранхіяльнай астмы, радыяцыйнага апраменьвання. Трэба толькі мець на ўвазе, што гранатавы натуральны сок неабходна разводзіць вадой, бо яго кіслата раз'ядае зубную эмаль. А яшчэ ён проціпаказаны пры язве, гастрытах і падвышанай кіслотнасці страўніка.

А кветкі граната, лепш за ўсё сушаныя, можна заварваць накшталт гарбаты — такі адвар прынясе карысць гіпертонікам.

Ешце з розумам!

**Настасся Шамрэй**

# Зімовая рыбалка — што, дзе і як

Практычныя парады для пачаткоўцаў.

Хутка снежань, а значыць прыйдзе пара зімовай рыбалкі. Найперш варта памятаць, што ісці на зімовую рыбалку варта ў кампаніі. Першы лёд заўсёды ненадзейны.

На рыбалку трэба цёпла апранацца. Абутак мусіць быць не зусім вольны, але і не цесны. Ногі павінны быць сухімі. Ні ў якім разе не грэйцеся алкаголем! Вазьміце тэрмас з гарачым пітвом.

Што за рыба бярэцца зімой? Судакі, шчупакі, ляшчы, плоткі і язі актыўныя напачатку зімы і напрадвесні. Акуні ды налімы ловяцца ўсю зіму аж да нерасту. Ловяць рыбу на чарвякоў і матыля, на жыўца і блешню.

Калі берагі вадаёмаў закоўваюцца ў лёд, рыба сыходзіць на глыбіню, хаваецца ў ямiны. Каб не прыходзіць дамоў з пустой торбай, рыбаку-пачаткоўцу трэба вывучыць месца палявання — рэльеф дна, плыні ракі.

Сучасныя крамы прапануюць багаты асартымент вудаў, а таксама іншага неабходнага начыння для зімовай рыбалкі.

**Сямён Печанко**

**Што рабіць, калі вы ўсё ж праваліліся пад лёд?**

Першае — пастарайцеся не панікаваць. Трэба выкінуць рукі ў бакі і павіснуць на краях палонкі. Потым пастарайцеся падцягнуцца, легчы на спіну і выпаўзці з вады. Толькі адпоўзшы на некалькі метраў ад палонкі, кладзіцеся на жывот.

### НАША СТРАВА

**Торт «Яўгіння»**

4 яйкі, 2 жаўткі, 300 г цукру, 40 г фісташак без шалупіння, 140 г бульбяной мукі, 26 г цукатаў, 100 салодкага міндалю, 3/4 шклянкі канфіцюру, 1/2 лыжкі масла, сухары для абсыпкі формы.

Яйкі і жаўткі расцерці з цукрам у густую аднародную масу, дадаць бульбяную муку, дробна парэзаныя цукаты, фісташкі і міндаль (палову фісташак і міндалю дробна пасекчы, палову — разрэзаць надвое). Мясіць цеста да пышнасці, раздзяліць на 2 ці 3 каржы і выпечы іх у духоўцы. Кожны корж намазаць канфіцюрам, скласці каржы адзін на адзін і заліць глазурай.

З кнігі: Вінцэнта Завадская, «Кухарка літоўская», 1858

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

### ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

**РОБІН-БОБІН**

Робін-Бобін-Ненажэра
схрумаў міліцыянера!
З'еў каня і сем цялят,
і дванаццаць парасят!
Згрыз палац і пяць дамоў,
і трынаццаць караблёў,
згамаў кузню, каваля
і самога караля!
Лондан з'еў і Ліверпуль,
выпіў рэчку — буль-буль-буль,
зжэр карову і быка,
рака, жабу і жука!..
Загарні хутчэй старонку,
каб цябе хоць ён не з'еў!

**Адаптацыя з украінскага перакладу Міколы Бугая**

### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ЭЛЕКТРЫК ШУКАЕ ПРАЦУ**

**Электрамантаж** праводкі, устаноўка свяцільнікаў, разетак, выключальнікаў. Сяргей. Т.: (029) 292-02-02.

**КЕЛЬЦКІ ДРАКОН**

**Запрашаем у школу** сучаснага ірландскага танца «Кельцкі дракон». Т.: (029) 155-54-43 (Кацярына), (029) 633-16-12 (Вячаслаў).

**ШУКАЮ**

**Шукаю кінастужкі:** «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Гальшанскі», «Маці ветру», «Сівая легенда». Т.: (029) 800-89-87 (МТС). Сяргей.

**СПАЧУВАННІ**

**Сябры выказваюць спачуванні Юрасю Шпаку-Рыжкаву** з нагоды смерці маці.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!




Вёску Баруны на Ашмяншчыне ведаюць перш за ўсё дзякуючы шыкоўнаму касцёлу пачатку XVIII стагоддзя. Велічэзны храм ніколі не бывае пустым і для маленькай вёскі выглядае добра дагледжаным.

Але ўвагу фатографа «НН» прыцягнуў будынак, што знаходзіцца аккурат за касцёлам. Збудаваны напрыканцы XVIII стагоддзя, ён напачатку належаў базыльянам. За Расіяй яго перадалі праваслаўным; у мінулым стагоддзі там працавалі настаўніцкая семінарыя, сельсавет, дзіцячы інтэрнат, дом культуры.

Сёння будынак закінуты і больш нагадвае прыбіральню.

**Юлія Дарашкевіч**

# Элегантны кляштар базылянаў у Барунах ператварылі ў прыбіральню









## Кіеў, сэнк ю фор э вандэфул шоу!

Фельетон.

— Добры вечар, Мінск!

— Добры вечар, Кіеў! Мінск на дроце... Сэнк ю фор э вандэфул шоу!

— Мінск, што ў вас там з баламі?

— Як заўсёды: 8 балаў Арменіі, 10 — Расіі, і нарэшце 12 балаў ідзе... Каму б вы думалі?.. Беларусі!

— Мінск, гэта немагчыма!

— Чаму? Юра ж Дземідовіч зэ бэст — мы ўсе так і запісалі ў эсэмэсках: спяваў афігіцельна!

— Самім сабе даваць нельга!

— Хіба ж мы сабе?! Мы што ж, правіл не ведаем?! Усё найлепшае дзецям! Вы што, думаеце нам гэтая статуэтка з пазалочанага каўчуку патрэбная?! Усё ж дзеля маладога пакалення... Кіеў, маркуйце самі: македонцы дораць балы сербскім дзецям, армяне — грузінскім, галандцы — нідэрландскім. А хто нашым дзеткам дасць? Вялікае Княства Ліхтэнштэйн? Так і з чароўным нулікам застацца можна...

— Мінск, не выдурняйцеся! Які яшчэ чароўны нулік: у вас ужо Ксенія Сітнік выйгравала і яшчэ там адзін хлопчык...

— А ў нас план на пяцігодку: адзін дзіцячы пераможца «Еўрабачання» на кожныя тры мільёны насельніцтва.

— Мінск, дык вас жа дзесяць мільёнаў, то бок мільён лішні...

— Слухайце, Кіеў, ну, вы там у сваім «Еўрабачанні» зусім крыважэрныя: вы што, хочаце пазбыцца мільёна людзей, замест таго, каб проста даць аднаму чалавеку выйграць конкурс?! Што вы яшчэ нам прапануеце, даць беларускае грамадзянства Рыбаку, каб на размеркаванні ў Малых Дуркавічах ён нарэшце у сваю «Казку» патрапіў?!

— Добра, Мінск, не цісніце музычным інтэлектам! 12 балаў ад Беларусі ідзе Беларусі. Сэнк ю фор э вандэфул шоу!

**Ліза Кавальчык**

## АНЕКДОТЫ

Тата застаўся з маленькай дачкой адзін і ўвечары ніяк не можа пакласці яе спаць.

Усё, што мог, пераспрабаваў. Дачка кажа:

— А ты пашапчы мне на вушка, як маме.

Тата нешта шэпча. Дачка, засынаючы:

— Не, не! Я стомленая, як сабака!

* * *

На дне народзінаў дзядулі ягоны маленькі ўнук:

— Дзеду, а колькі табе гадоў?

— Шэсцьдзесят два.

Унук, трохі памаўчаўшы, з сумневам у голасе:

— А ты пачаў з аднаго?

***

Можна глядзець бясконца на тры рэчы: як гарыць агонь, як даюць зарплату і як паркуецца жанчына.

***

Дзве адэсіткі сварацца:

— Ах ты, старая курва!

Другая, з крыўдай:

— Прычым тут узрост?

***

Кіроўца! Памятай! На дарогах Расіі цябе не чакаюць!

***

Даўным-даўно, калі расійскія хакеісты яшчэ не маглі выйграць у канадцаў, рускія прыдумалі рускі хакей — хакей з мячом.

Цяпер, калі надышоў той час, калі расійскія футбалісты не могуць выйграць у славенцаў, час прыдумаць расійскі футбол — футбол з шайбай!

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Гродна.** З восені ў нас перуном прыбіла дзяўчыну. Яе пахавалі. Уночы сторож на могілках пачуў енк адтуль, дзе была свежая магіла. Але махнуў рукой і пайшоў спаць. Назаўтра паліцыя адкапала дамавіну і аказалася, што дзяўчына была ў летаргічным сне. Не памерла, а толькі заснула. Ачнуўшыся, задушылася: валасы мела парваныя і твар пашарпаны.

**НН. №48. 1909**

**Саюзная дамова — не такая пустая паперка, як шмат хто думае**

*Прафесар Міхаіл Пастухоў, былы намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда, кіраўнік апазіцыйнай дэлегацыі на кансультацыях пад эгідай АБСЕ.*

— Перш-наперш яна супярэчыць самому статусу Рэспублікі Беларусі як суверэннай незалежнай дзяржавы, бо аб’яднанне з мацнейшай краінай вядзе да падрыву самастойнасці. Па-другое, дамова супярэчыць статусу Беларусі як бяз’ядзернае дзяржавы: яднанне з Расіяй — звышдзяржавай, якая мае ядзерную зброю — тоіць у сабе пагрозу змены статусу нашае рэспублікі.

**НН. №34. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6195. Газета выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 24.11.2009.

Замова № 6466.

Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.

Цана дамоўная.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614